Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

СТУДЗЕНЬ 28 1933 г.
№ 22 (4566)
Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Горача вітаю „РАБОТНИЦУ“ ў дзень дзесяцігодзьдзя яе існаваньня. Жадаю ёй посьпехаў у справе выхаваньня жаночых пралетарскіх мас у духу барацьбы за поўную перамогу сацыялізму, у духу выкананьня вялікіх наказаў нашага настаўніка—Леніна.

І. СТАЛІН

ВЫНІКІ ПЯЦІГОДКІ І ПЛЯН 1933 ГОДУ

Даклад старшыні Савету Народных Камісараў Саюзу ССР тав. В. М. МОЛАТАВА (СКРАБІНА) на III сэсіі ЦВК СССР 23 студзеня 1933 году

I.

ПАЛІТЫЧНАЕ ЗНАЧЭНЬНЕ ВЫНІКАЎ ПЯЦІГОДКІ

1. НАШЫ ВЫНІКІ--АСНОВА ДАЛЕЙШАГА РОСТУ

Таварышы! Народна - гаспадарчы плян 1933 г. ёсьць працяг справы першай пяцігодкі. Таму мне прыдзецца спыніцца і на выніках першай пяцігодкі.

Я ня зьбіраюся рабіць падрабязнага дакладу па гэтым пытаньні. Усё асноўнае для ацэнкі вынікаў першай пяцігодкі сказана ў дакладзе тав. **Сталіна.** Лепш ня сказаш. Мне прыдзецца спыніцца на выніках першай пяцігодкі, галоўным чынам, у сувязі з задачамі бягучага году, у сувязі з агульнай супугранай і міжнароднай абстаноўкай.

Выкананьне першай пяцігодкі зьяўляецца вялізарнейшай перамогай рабочай класы і працоўных мас Савецкага саюзу. Выканана вялізарная праграма гаспадарчага і культурнага буданіцтва, значэньне якой накуль ня можа немагчыма поўнасьцю ацаніць.

Вы прыпомніце, што пры разглядзе праектаў першага пяцігадовага пляну абмяркоўваліся два варыянты пяцігодкі: першы — адпраўны і другі — аптымальны. Так званы «адпраўны» варыянт быў, па думцы дзяржаўнай плянавай камісіі, разьлічан на сярэднія ўмовы, а другі «аптымальны» варыянт — на магчымыя больш спрыяючыя ўмовы. У той час плянавыя органы схіляліся да першага, меншага варыянту. Але партыя, а потым і V зьезд Саветаў прынялі за аснову **аптымальны** варыянт, т. зн. варыянт з павышанымі заданьнямі.

Мы ня можам сказаць, што прайшоўшыя чатыры гады былі, — з пункту гледжаньня знадворных аб'ектыўных умоў, — ва ўсіх адносінах і ў поўнай меры спрыяючымі для сацыялістычнага буданіцтва ў СССР. І для нашага буданіцтва вялікае значэньне меў факт сусьветнага эканамічнага крызісу, які прыбыў да вялізарнага паданьня сусьветных цэн, што стварыла нямала затрудненьняў для нашага экспарту. З другога боку, у 1931 годзе ў радзе буйнейшых збожжавых раёнаў Паўночнага Усходу мы мелі значны неўраджай, а, як вы ведаеце, ад **збожжа** ў нас залежыць вельмі і вельмі многае. І, ня гледзячы на ўсё гэта, мы выканалі пяцігодку за чатыры гады, пяцігодку ў яе аптымальным (найбольшым) варыянце. Выкананьнем **найбольшага** варыянту пяцігодкі за **чатыры** гады — такой перамогай рабочая класа нашай краіны мае права ганарыцца!

З усіх вынікаў пяцігодкі я спынюся толькі на двух асноўных: па-першае, на індустрыялізацыі і, па-другое, на сацыялістычных формах у СССР.

У цэнтры палітыкі савецкай улады за ўвесь прайшоўшы пэрыяд стаяла задача індустрыялізацыі краіны. Нашы посьпехі ў ажыцьцяўленьні гэтай задачы мелі рашаючае значэньне. Палітыка індустрыялізацыі, галоўны сэнс якой заключаецца ў максымальным развіцьці цяжкай прамысловасьці і, значыцца, у максымальным разгортваньні вырабу сродкаў вытворчасьці, дала ўжо свае рэзультаты. Правядзеньне гэтай палітыкі ў нашых умовах было зьвязана з вялізарнымі труднасьцямі, з найвялікшым напружаньнем сіл. Але, перамагаючы ўсе і ўсякія труднасьці, мы дабіліся асноўнага: **наша краіна з аграрнай ператварылася ў індустрыяльную.** Учора яшчэ галоўную ролю ў народнай гаспадарцы адыгравала сельская гаспадарка з яе адсталай тэхнікай і значна больш паловы прадукцыі ўсёй нашай гаспадаркі давала яна. За гады пяцігодкі значна вырасла ня толькі прадукцыя прамысловасьці, але і прадукцыя сельскай гаспадаркі. І ўсё-ж пасьляўчае правядзеньне палітыкі індустрыялізацыі прывяло нас да таго, што цяпер індустрыя з яе перадавой тэхнікай зьяўляецца галоўнай сілай у нашай гаспадарцы, што цяпер значна больш паловы ўсёй прадукцыі народнай гаспадаркі дае сацыялістычная прамысловасьць. Разгортваючы нашу прамысловасьць і асабліва разгортваючы цяжкую прамысловасьць, мы дабіліся ператварэньня СССР у перадавую індустрыяльную краіну.

Палітыка індустрыялізацыі нам патрэбна была, аднак, ня проста дзеля развіцьця прамысловасьці. Гэта палітыка зьяўляецца асновай буданіцтва **сацыялізму,** сэнс якога ў зьнішчэньні эксплёатацыі чалавека чалавекам. Толькі на гэтай аснове можна па-сацыялістычнаму перабудоўваць усю народную гаспадарку, маючы пры гэтым такую прадпасылку ўсіх прадпасылак, як **саветы,** г. зн. улаву рабочай класы.

І сапраўды, за пэрыяд пяцігодкі ў нас адбыліся карэнныя зьмены ў сацыялістычным буданіцтве. Сацыялістычныя формы атрымалі верх і там, дзе вякамі панавалі найбольш адсталыя ў гаспадарчых адносінах формы індывідуальнай, дробна-ўласьніцкай сялянскай гаспадаркі. Посьпехі калектывізацыі і палітыкі ліквідацыі кулацтва як класы, пры вялізарным размаху саўгаснага буданіцтва за апошнія гады, зрабілі магчымым карэнны пераварот у вёсцы. Сацыялізм, нарэшце, перамог і ў сельскай гаспадарцы. Калгасны лад зрабіўся пануючым у вёсцы. Замест шматлікай колькасьці дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак в нямінучым пры гэтым ростам вясковых павукоў — кулацтва і невялікай колькасьці калгасаў і саўгасаў, за пэрыяд пяцігодкі ўзьнікла многа дзесяткаў тысяч новых калгасаў і некалькі тысяч саўгасаў. У рэзультаце гэтага чатыры пятых пасеваў ужо ў мінулым годзе праводзілася калгасамі і саўгасамі. Пры ўсіх недахопах калгаснага буданіцтва, в калгасаў ужо больш няма адзіных. Калгасная форма перамагла канчаткова. Справа ў практычнай рабоце па ўмацаваньні калгасаў.

Усё гэта стала магчымым толькі дзякуючы таму, што краіна магутна ўмацавалася ў прамысловых адносінах і дзякуючы гэтаму здолела падвесьці пад развіцьцё сацыялістычных форм у сельскай гаспадарцы моцную машына-трактарную базу. Перад сельскай гаспадаркай адкрыліся новыя пэрспэктывы. Сельская гаспадарка толькі цяпер падыйшла да сапраўднага свайго ўздыму.

Сацыялістычныя формы занялі цяпер пануючае становішча і ў прамысловасьці, і ў сельскай гаспадарцы, і ў таваразвароце. Няма такой галіны гаспадаркі ў нашай краіне, дзе сацыялістычныя формы ня былі-бы пераважаючымі, ня мелі-б сапраўды рашаючага значэньня. Пяцігадовы плян прадугледжваў непараўнальна меншыя тэмпы разьвіцьця сацыялістычных форм гаспадаркі. Тут заданьні пяцігодкі намнога перавыкананы. А гэта-ж, нарэшце, мае рашаючае значэньне для канчатковай перамогі справы рабочай класы. Наша задача заключалася ня толькі ў тым, каб выканаць плянавыя заданьні пяцігодкі, скажам, па прамысловасьці, на 100 проц. Як вядома, у гэтых адносінах мы нават маем па прамысловасьці некаторае недавыкананьне, бо пяцігодка па прамысловасьці выканана толькі на 94 проц. (чаму былі свае, вядомыя вам, прычыны,— прычыны, далёка ад нас незалежачыя). Але і пры гэтым па цяжкай прамысловасьці яна выканана ня толькі на 100 проц., а на ўсе 108 проц., г. зн. па цяжкай прамысловасьці пяцігодка значна перавыкананa. Галоўная-ж задача савецкай улады была ў забесьпячэньні перамогі сацыялістычных форм у народнай гаспадарцы. Гэту галоўную задачу мы вырашылі з посьпехам, з такім посьпехам, аб якім мы і ня марылі, прымаючы пяцігадовы плян чатыры гады назад. Палітыка **сацыялістычнай індустрыялізацыі** дала свой рэзультат: справа сацыялізму ў нашай краіне моцна і канчаткова **перамагла.**

Прывяду толькі некалькі ілюстрацый таго, у што вылілася наша буданіцтва за прашоўшы пэрыяд пяцігодкі.

Адным з самых характэрных момантаў гэтага пэрыяду зьяўляецца **рост** і ўзьнікненьне **новых** індустрыяльных цэнтраў у краіне. Яшчэ некалькі год таму назад некаторыя з цяперашніх буйных індустрыяльных ачагоў былі мала прыкметны на карце СССР. А цяпер, у рэзультаце пяцігодкі, мы маем у кожнай рэспубліцы і ў кожнай вобласьці або буйны індустрыяльны цэнтр, які ўжо складаўся, або закладзеную аснову для разгортваньня новага індустрыяльнага ачагу.

На самой справе, ці многія ведалі некалькі год таму назад аб такіх пунктах, як Бярэзьнікі, Бобрыкі, Караганда, Хібінагорск, Магнітагорск? А цяпер, усяго за некалькі год, Бярэзьнікі і Бобрыкі — буйнейшыя цэнтры хімічнай прамысловасьці, і ў кожным з іх па 40 тыс. жыхароў. Проста з пад зямлі вырас за некалькі год Хібінагорск, як буйны, хутка ўзрастаючы цэнтр горна-хімічнай справы, які мае ўжо цяпер звыш 35 тыс. жыхароў. У Карагандзе, гэтым узрастаючым вугальным раёне ў Казакстане, ужо 100 тыс. жыхароў; у Магнітагорску, аб значэньні якога для нашай мэталюргіі цяпер усім вядома, звыш 200 тыс. жыхароў. Яшчэ нядаўна малапрыкметныя сібірскія пасёлкі, а цяпер — прамысловыя гарады, як Ленінск-Кузьнецк (вугальны раён) з 65 тыс. жыхароў, Сталінск (Сібірскі цэнтр мэталюргіі) з 180 тыс. жыхароў, Кемерава (вугальна-мэталюргічны раён) з 110 тыс. насельніцтва. З невялікіх сібірскіх гарадоў Анжэра-Суджэнск (вугальны раён) і Прокоп'ёўск (вугальны раён) і Уральскі Ніжні Тагіл (мэталюргічны раён) ператварыліся ў буйныя прамысловыя гарады, у кожным з іх па 100 тыс. насельніцтва, а часамі і больш. Такія гарады, як Запарожжа з яго Дняпрабудам, Луганск, Сталіна і Макеёўка на Украіне, Нова-Сібірск у Зах. Сібіры, Чалябінск, Перм, Сьвярдлоўск на Урале, Сталінград на Волзе, вырасьлі за якіх-небудзь чатыры гады ў два разы, а некаторыя (напрыклад, Сьвярдлоўск) больш чым у тры разы. Можна-б прывесьці яшчэ дзесяткі гарадоў і прамысловых цэнтраў, якія за апошнія гады хутка разгортваюць сваю прамысловасьць і ў літаральным сэнсе ператвараюцца на нашых вачох. Так, нарэшце і Баку, і Харкаў, і Ленінград, і Масква хутка растуць, будуюцца і абнаўляюцца. Аб усім вам, і асабліва маскавічом, вядомых фактах ня буду гаварыць.

Паказальны таксама гаспадарчы і культурны рост асобных **рэспублік** СССР. Гэты рост ідзе ва ўсіх саюзных і аўтаномных рэспубліках і нацыянальных абласьцях. Пры вяду толькі некалькі лічбаў аб нашых саюзных рэспубліках.

Вось даныя аб бюджэтах. За чатыры гады пяцігодкі мясцовыя бюджэты РСФСР, Украіны і Закаўказкай Федэрацыі вырасьлі больш чым у два разы. Бюджэт Беларусі вырас амаль у тры разы. Бюджэты Узьбекістану і Туркмэністану вырасьлі больш чым у тры разы, а бюджэт Таджыкістану вырас у шэсьць раз. У гэтых любых знаходзіць сваё выяўленьне гаспадарчы і культурны рост усіх раёнаў СССР.

Адзначу, яшчэ адзін момант, а іменна тое, у чым асабліва яркa праяўляецца рост **нацыянальных** культур. Я маю на мэце пытаньне аб пісьменнасьці. У старой Расіі толькі адна трэць насельніцтва ва ўзросьце ад 8 год і вышэй была пісьменнай, прычым у цяперашніх рэспубліках Сярэдняй Азіі пісьменнасьць насельніцтва не дасягнула вышэй 2 проц. Савецкая ўлада з самых першых год разгарнула вялізарную культурную работу і перш за ўсё зьвярнула ўвагу на насаджэньне пісьменнасьці. Да сучаснага моманту на Украіне і ў Беларусі мы маем амаль стопроцантную пісьменнасьць, у РСФСР і Закаўказьзі каля 90 проц. Але што асабліва важна, так гэта тое, што і ў Сярэдняй Азіі мы дабіліся ўжо вялізарнага зруху: у Таджыкістане пісьменных да 30 проц., у Туркмэністане звыш 60 проц., ва Узьбекістане — звыш 70 проц. Для далейшага ўздыму нацыянальных культур работа праароблена, як бачыце, немалая.

Нарэшце, у адносінах росту ўсяго **насельніцтва** Савецкага саюзу мы таксама маем вельмі паказальныя даныя. У капіталістычных краінах ужо не з ўчарайшняга дня памецілася працэс памяншэньня прыросту насельніцтва, і гэта зьяўляецца адным з самых сур'ёзных прызнакаў ня толькі пагоршаньня ўмоў жыцьця мас, але і набліжэньня канца буржуазна-капіталістычнага рэжыму. У Савецкім саюзе мы маем хуткі рост насельніцтва. Ужо пад канец 1932 г. насельніцтва нашай краіны складала 165,7 млн. чалавек, павялічыўшыся за час пяцігодкі, правільней за чатыры гады, на 11,5 млн. чалавек. У гэтым гіганцкім росьце насельніцтва СССР выяўляецца жыцьцёвая сіла савецкага ладу. У гэтых узрастаючых мільёнах — будучае Савецкага саюзу.

Цяпер успомнім аб тым, што прадракалі нам нашы ворагі ў пачатку пяцігодкі, што яны гаварылі тады, калі мы прынялі першы пяцігадовы плян.

Вось, напрыклад, што гаварыў вядомы ідэолёг **дробнай буржуазіі,** ідэолёг трусьлівай сацыял-дэмакратыі, Карл Каўцкі ў брашуры «Бальшавізм у тупіку», напісанай у пачатку 1930 г.:

«Гэты шалёны эксперымэнт ня можа інакш скончыцца, як жудасным

(Працяг на 2 стар.)

БАЛЬШАВІКІ МЕНСКУ УХВАЛЯЮЦЬ ПАСТАНОВЫ АБ'ЯДНАНАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Рэзалюцыя пленуму Менгаркому, МенГКК КП(б)Б і менскага партактыву па дакладу тав. ГІКАЛО аб выніках аб'яднанага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б)

Пленум Менскага Гаркому і ГарКК сумесна з партактывам, заслухаўшы даклад тав. ГІКАЛО аб выніках аб'яднанага студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК, цалкам і поўнасьцю далучаецца да рашэньняў пленуму.

Рашэньні студзеньскага пленуму, якія падводзяць вынікі гераічнай барацьбы партыі за выкананьне першай пяцігодкі, зьяўляюцца вялізарнейшай падзеяй сучаснай эпохі і з усёй выразнасьцю паказваюць гістарычную нягрунтоўнасьць і банкрутства сыстэмы сусьветнага капіталізму перад тварам непераможнай магутнасьці растучага сацыялізму.

Поўнасьцю вырашана асноўная задача першай пяцігодкі — стварэньня ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі. СССР з краіны аграрнай, залежачай ад капрызаў капіталістычных краін, ператворан у краіну індустрыяльную і магутную, упаўне самастойную і незалежачую ад капрызаў сусьветнага капіталізму, у краіну, здольную абараняць сацыялістычнае буданіцтва ад усякіх нападак звонку.

На аснове гіганцкага росту індустрыі, снабжаючы сельскую гаспадарку трактарамі і новымі сельгасмашынамі, партыя дабілася аб'яднаньня дробных аднаасобных сялянскіх гаспадарак у буйныя калектыўныя гаспадаркі, пасьпяхова праводзячы на гэтай аснове палітыку ліквідацыі кулацтва, як класы.

«Рабочая класа СССР, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, пасьпяхова выканала асноўную задачу пяцігодкі — стварэньня ўласнай перадавой тэхнічнай базы для сацыялістычнай рэканструкцыі ўсёй народнай гаспадаркі».

Вялізарнейшай заваёвай рабочае класы і працоўнага сялянства ў краіне пераможнага сацыялізму зьяўляецца зьнішчэньне беспрацоўя і ліквідацыя няўпэўненасьці ў заўтрашнім дні сярод рабочых, ахоп калгасным буданіцтвам амаль усёй беднаты і зьнішчэньне галечы і паўпэрызму ў вёсцы.

Перамогі пяцігодкі з усёй перакананасьцю паказваюць усяму сусьветнаму пралетарыяту, працоўным і прыгнечаным усіх краін, што дыктатура пралетарыяту і савецкая сыстэма зьяўляюцца для іх адзіным шляхам вызваленьня ад голаду, беспрацоўя і жабрацтва.

Вялізарнейшых перамог першай пяцігодкі рабочая класа СССР дасягнула пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, яе ленінскага ЦК на чале з правадыром і настаўнікам партыі і рабочае класы тав. СТАЛІНЫМ, у бязьлітаснай барацьбе з клясавым ворагам, «у барацьбе за няўхільнае і пасьлядоўнае правядзеньне генэральнай лініі партыі, у барацьбе з правым апартунізмам, як галоўнай небясьпекай, у барацьбе з «лявацкімі» перагібамі і контр-рэвалюцыйным трацкізмам, шляхам бязьлітаснага разгрому антыпартыйных груповак, шляхам рашучага выкрыцьця клясавага ворага з партбілетам у кішэні з ліку буржуазных перараджэнцаў».

Пленум сумесна з партактывам асобна падкрэсьлівае выключную, сусьветна-гістарычную ролю правадыра партыі і міжнароднага пралетарыяту, найвялікшага з паплечнікаў Леніна — тав. Сталіна, які забясьпечвае сваім кіраўніцтвам згуртаваньне і адзінства ленінскай бальшавіцкай партыі ў непрымірымай барацьбе за рашаючыя перамогі пяцігодкі.

Вялізарнейшай перамогай партыі і рабочае класы зьяўляецца ператварэньне нацыянальных акраін, эканамічна і культурна адсталых, якія зьяўляліся да пралетарскай рэвалюцыі аб'ектам калёніяльнай эксплёатацыі ў эканамічна і культурна перадавыя рэспублікі нашага Саюзу.

Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага буданіцтва Савецкай Беларусі: тэмпы разьвіцьця народнае гаспадаркі, выпераджаючыя агульнасаюзныя тэмпы, рост рабочае класы за гады рэвалюцыі з 11 тысяч да 100 тысяч, дасягненьні ў галіне калектывізацыі, пад'ём матар'яльнага і культурнага ўзроўню шырокіх мас працоўных, рост нацыянальных кадраў,—усё гэта на фоне эканамічнага руйнаваньня Заходняй Беларусі, прыгнечаньня польскага фашызму і зьверскай расправы з беларускім нацыянальна-вызваленчым рухам зьяўляецца яскравым паказальнікам вялізарнейшых посьпехаў ленінскай нацыянальнай палітыкі.

Вызначаны пленумам ЦК і ЦКК сярэдні гадавы прырост прамысловай прадукцыі ў другой пяцігодцы ў 13—14 проц. і народна-гаспадарчы плян на 1933 г. ставяць перад усімі партарганізацыямі, перад кожным бальшавіком, перад усімі рабочымі задачу ўпартай і настойлівай барацьбы за асваеньне новых вытворчасьцяй і дасягненьне праектнай магутнасьці, за падняцьце прадукцыйнасьці працы, за паляпшэньне якасьці прадукцыі і зьнижэньне сабекошту, за поўнае і бязумоўнае выкананьне вытворчай праграмы, за павышэньне рэвалюцыйнай пільнасьці і ўзмацненьне барацьбы з прыкіненьнем клясава-варожых элемэнтаў у сацыялістычныя прадпрыемствы.

У сьвядомасьць кожнага рабочага і калгасьніка павінна быць укаранена, што... «энтузіязм, пафас новага будаўніцтва... «павінны мы дапоўніць энтузіязмам, пафасам асваеньня новых заводаў і новай тэхнікі, сур'ёзным падняцьцем прадукцыйнасьці працы, сур'ёзным зьнижэньнем сабекошту. У гэтым зараз галоўнае». (СТАЛІН). Вырашэньне гэтых задач патрабуе новага, магутнага пад'ёму сацспаборніцтва і ўдарніцтва, бязьлітаснай барацьбы з лодырамі, лятунамі, прагульшчыкамі—дэзарганізатарамі вытворчасьці.

Пленум Менгаркому сумесна з партактывам зьвяртае ўвагу ўсёй партарганізацыі і кожнага камуніста на гістарычную прамову тав. СТАЛІНА «Аб працы на вёсцы», як на баявую ленінскую праграму, у барацьбе за далейшую сацыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі. Высунутыя тав. Сталіным задачы набываюць вялікае значэньне ва ўмовах Беларусі і Менскага раёну, дзе ўрокі сельска-гаспадарчых заготовак цалкам і поўнасьцю пацьвярджаюць ускрытыя ў прамове тав. Сталіна карэньні недахопаў у нашай рабоце на вёсцы, якія выявіліся ў недаацэнцы падвойнасьці прыроды калгаснага гандлю, у спробах падмяніць дакладнае бальшавіцкае кіраўніцтва калгасным рухам дробна-буржуазнай ідэалізацыяй калгасаў, няўменьнем ускрыць новыя манэўры клясавага ворага і дабіцца ачысткі ад кулацкіх і контр-рэвалюцыйных элемэнтаў, якія выявіліся ў гніла-лібэральных адносінах партыйных і савецкіх арганізацый да заготовак.

Вопыт заготовак па БССР наглядна пацьвердзіў усю правату ўказаньняў т. Сталіна аб тым, што «мы стаім на чале ўлады, мы ўладаем сродкамі дзяржавы, мы закліканы кіраваць калгасамі, і мы павінны несьці ўсю паўнату адказнасьці за работу на вёсцы».

Арганізуемыя палітаддзелы пры МТС і саўгасах павінны стаць магутнейшым вагаром у руках партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, па сацыялістычным перавыхаваньні калгасьнікаў і далейшым узмацненьні пазыцый пралетарскай дзяржавы на вёсцы. Пленум даручае бюро ГК КП(б)Б неадкладна прыступіць да падбору 100 праверaных і выпрабаваных на канкрэтнай справе бальшавікоў на работу ў палітаддзелы і кіруючую работу ў сельсаветы і калгасы.

У цэнтры ўвагі ўсёй партарганізацыі і кожнага камуніста ў паасобку на бліжэйшы час павінна быць пастаўлена ўдарная падрыхтоўка і правядзеньне веснавой пасеўнай кампаніі і поўнае забесьпячэньне выкананьня дырэктыў партыі аб рашучым падняцьці ўраджайнасьці. Магутным вагаром у гэтых адносінах павінен паслужыць новы закон Саўнаркому СССР і ЦК УсеКП(б) «Аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і аднаасобнымі гаспадаркамі».

Бліжэйшай задачай усёй КП(б)Б, у першую чаргу Менскай арганізацыі, зьяўляецца завяршэньне ўсіх відаў заготовак, у асабліваасьці ільну і бульбы з тым, каб пляны былі выкананы ўсімі раёнамі, сельсаветамі, вёскамі, калгасамі і дворамі.

Далейшае разгортваньне таваразвароту паміж горадам і вёскай патрабуе ўзмацненьня барацьбы за выраб тавараў шырокага спажываньня, усямернага павялічэньня рыначных фондаў, а таксама ўсямернага паляпшэньня прыгарадных гаспадарак і работы па стварэньні ўласнай харчовай базы на кожным прадпрыемстве. Усё гэта павінна зьявіцца адзэй з важнейшых задач кожнай партарганізацыі, кожнай прафсаюзнай арганізацыі, кожнага гаспадарніка ў справе далейшага паляпшэньня матар'яльнага дабрабыту і бытавога абслугоўваньня рабочых.

Нашы перамогі выклікаюць шалёнае супраціўленьне разгромленага, але яшчэ канчаткова не дабітага клясавага ворага, які мякае мэтады і тактыку сваёй барацьбы. У гэтых умовах «рэвалюцыйная пільнасьць і гатоўнасьць зьнішчыць клясавага ворага павінны зьяўляцца асноўным наказам камуніста і галоўнай прадпасылкай далейшага прасоўваньня ўперад».

Пленум Менгаркому сумесна з партактывам ухваляе рашэньні ЦК УсеКП(б) аб антыпартыйнай групоўцы Эйсмонта, Талмачова, Сьмірнова і інш. На рубяжы двух пяцігодак, збанкрутаваўшая кучка буржуазных перараджэнцаў, даўрушыўшаў, выконвала сацыяльны заказ рэшткаў капіталістычных элемэнтаў унутры краіны і міжнароднай контр-рэвалюцыі.

Лічачы папярэджаньне пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) былым пазорам правай апазыцыі Томскаму, Рыкаву, Шмідту, якія падтрымлівалі сувязь з Сьмірновым і Эйсмонтам і давалі повад сваімі паводзінамі ўсім антыпартыйным элемэнтам разьлічваць на іх падтрымку апошнім. Пленум сумесна з партактывам патрабуе ад Томскага, Рыкава і Шмідта безагаворачнага выкананьня ўсіх патрабаваньняў, прад'яўленых да іх пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б). Пленум з партактывам лічаць, што малейшае хістаньне ў далейшым каго-небудзь з былых лідэраў права-кулацкай апазыцыі павінна пацягнуць неадкладнае прыняцьце самых суровых мер партыйнага спагнаньня.

Пленум падкрэсьлівае, што выкананьне гістарычных задач, пастаўленых студзеньскім пленумам ЦК і ЦКК УсеКП(б) перад партыяй і рабочай клясай, калгасным сялянствам, патрабуюць ад кожнай ячэйкі, ад кожнага камуніста ў паасобку ўзмацненьня адказнасьці за даручаемую работу, вялізарнага ўзмацненьня жалезнай партыйнай дысцыпліны, вялізарнай рэвалюцыйнай пільнасьці, бязьлітаснай барацьбы з клясавым ворагам і бальшавіцкай непрымірымасьцю ў барацьбе з яго агентурай — апартунізмам усіх адценьняў, буржуазна-нацыяналістычнымі элемэнтамі, рэшткамі нацдэмаўшчыны, якія заўсёды прыкрываюць сваю антысавецкую работу фальшыва-нацыянальным сьцягам.

Пленум вітае рашэньне ЦК і ЦКК УсеКП(б) «арганізаваць справу чысткі такім чынам, каб забясьпечыць у партыі жалезную пралетарскую дысцыпліну і ачышчэньне партыйных радоў ад усіх ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў».

Пленум рашуча абавязвае ўсю партарганізацыю шляхам неаслабнага разгортваньня самакрытыкі, ня гледзячы на асобы, весьці далейшую, настойлівую, сапраўды бальшавіцкую работу па выяўленьні, выкрыцьці і ачышчэньні партыі ад ненадзейных, няўстойлівых і прымазаўшыхся элемэнтаў, наносячы разам з тым руйнуючыя ўдары малейшым праяўленьням сямейнасьці, групоўшчыны, кругавой парукі, спробам захаваць, замазаць злоўжываньні, прарывы і недахопы ў рабоце; малейшым спробам заціску бальшавіцкай самакрытыкі. Асаблівы ўпор павінен быць зроблен на барацьбу са славеснай дэкляратыўнасьцю ў самакрытыцы, на барацьбу супроць прымірэнцтва і гніла-лібэральных адносін да канкрэтных носьбітаў злоўжываньняў, прарываў, недахопаў і памылак; на неабходнасьць падмацаваньня самакрытыкі канкрэтнай справай выкрыцьця і ачысткі нашых радоў ад апартуністаў, перараджэнцаў, аліпуйшчыкаў, гнільля, жулікаў і гультаёў.

«Галоўнейшай задачай партыйных, савецкіх і прафсаюзных арганізацый, кожнага камуніста, рабочага і калгасьніка зьяўляецца рашучая барацьба з раскрадваньнем грамадзкай маемасьці, далейшае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, павышэньне рэвалюцыйнай клясавай пільнасьці». «Моцная і магутная дыктатура пралетарыяту — вось што нам патрэбна цяпер для таго, каб расьсеяць ушчэнт апошнія рэшткі паміраючых клясаў і разьбіць іх зладзейскія махінацыі» (Сталін).

Аб'яднаны пленум ГК і ГарКК сумесна з актывам са здавальненьнем канстатуе, што пачатая перабудова работы партыйных і савецкіх арганізацый на аснове рашэньня ЦК УсеКП(б) у ходзе сельска-гаспадарчых заготовак забясьпечыла ў асноўным ліквідацыю прарыву па заготоўках і бальшавіцкае іх выкананьне ва ўстаноўленыя Цэнтральным Камітэтам тэрміны.

Пад апэрацыйным і канкрэтным кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. ГІКАЛО, забясьпечыўшым бальшавіцкае правядзеньне заготовак, кампартыя Беларусі змагла на аснове перамаганьня гніла-лібэральных адносін да заготовак, нанесьці руйнуючы ўдар па кулаку, пачаць ачыстку сваіх радоў ад перараджэнскіх элемэнтаў і яшчэ вышэй узьняць аўтарытэт партыі ў вачох шырокіх мас працоўных.

Пленум Менгаркому асабліва падкрэсьлівае неабходнасьць замацаваньня і далейшага паглыбленьня перабудовы партыйнай і савецкай работы для забесьпячэньня падрыхтоўкі і пасьпяховага правядзеньня веснавой сяўбы.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута на перабудову работы савецкіх і гаспадарчых арганізацый, перш за ўсё тых, куды, як паказалі справы Белдзяржснабу, Дзяржземтрасту і іншых, пралезьлі клясава-варожыя элемэнты, рэшткі нацдэмаў, шкоднікі і дзе таксама моцны элемэнты расхлябанасьці, бездапказнасьці і г. д.

Пленум сумесна з партактывам запэўнівае ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, што, узброеная бальшавіцкімі рашэньнямі пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), Менская партарганізацыя, пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, будзе ў перадавых радох ленінскай партыі ў барацьбе за ажыцьцяўленьне задач, пастаўленых пленумай, за выкананьне пляну другой пяцігодкі.

Нахай жыве ленінскі ЦК УсеКП(б)!

Нахай жыве правадыр нашай партыі і сусьветнага пралетарыяту тав. СТАЛІН!

ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ тав. МОЛАТАВА

крушэньнем... Справа стаіць ня так, што эксперымэнт, **напэўна**, ня ўдасца, а так, што можна з **поўнай упэўненасьцю** сказаць, што ён пацярпіць крушэньне, і павінен, яго пацярпець». (Падкрэсьлена Каўцкім — **В. М.**).

Але справа ня толькі ў бяззубых старых **лазунгах Карла Каўцкага.**

Возьмем другі прыклад. Я напомню аб тым, што пісаў адзін з выдатных буржуазных журналістаў у сярэдзіне 1929 году, пасьля прыняцьця Зьездам Саветаў пяцігадовага пляну. Як сапраўдны **буржуа**, які не дапускае мысьлі аб перамозе сацыялізму, ён не пасароміўся сказаць нешта такое, што цяпер павінна гучэць для буржуазнага вуха чысьціц **лазунгам жалобнай песьні.** Прыведу слова п. Шэфэра з вядомай германскай буржуазнай газэты «Бэрлінэр тагэблят» ад 25-VI—1929 г. Вось што там было пісана прыкладна чатыры гады таму назад:

«Калі эксперымэнт удасца паваг **толькі на тры чвэрці,** дык ня прыдасьцца больш сумняваціца ў канчатковай перамозе. Гэта была-б тэзы **перамогі сацыялістычнага мэтаду,** дасягнутая сіламі маладога, здольнага верыць, таленавітага народу» (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

Як-жа цяпер быць панам Шэфэрам? Пяцігодка-ж выканана не на тры чвэрці, а выканана па-сапраўднаму і прытым за чатыры гады. Можа быць вы, паны **лёрды**, цяпер прызнаеце сваё пораджэньне і перамогу рабочай клясы? Але мы не разьлічаем на гэта. Прызнаць-жа перамогу рабочай клясы, прызнаць перамогу сацыялізму ў СССР для павоў буржуа азначае — падпісаць сабе сьмяротны прыгавор сваёй уласнай рукой.

2. КРЫЗІС І ПЭРСПЭКТЫВЫ КАПІТАЛІЗМУ

Пагляджэньне на тое, што рабілася за гэтыя гады ў **капіталістычных** краінах.

У той час, як Савецкі саюз гаспадарча умацоўваўся і ўзьнімаўся з кожным годам, у капіталістычных краінах эканамічны крызіс хутка пашыраўся і шоў усё больш у глыбіню. На адным баку — чатыры гады бальшавіцкай пяцігодкі, пяцігодкі няўхільнага росту і ўдзьму гаспадарки, на другім баку—запраз у гэтыя 4 гады, 1929—1932 г. г. — разгарнуўся такі эканамічны крызіс, якога яшчэ ніколі за ўсю гісторыю капіталізму ня бывала.

Супастаўленьне вынікаў разьвіцьця СССР з вынікамі капіталістычнай гаспадаркі ўсяго сьвету за апошнія гады вельмі павучальнае.

Пастараюся аблягчыць гэту задачу самым простым спосабам.

Я прыведу вытрымкі з уплывовай буржуазнай ангельскай газэты «Таймс» аб тым, як гэта газэта ацэньвала эканамічнае становішча Англіі і ўсяго капіталістычнага сьвету за ўсе гэтыя чатыры гады. Для пачатку я прыведу вытрымку з гэтай газэты **ад 1 студзеня 1929 г.** Тады ў артыкуле «Лепшыя пэрспэктывы» газэта «Таймс» так ацэньвала пэрспэктывы 1929 г.:

«Калі разглядаць пэрспэктывы брытанскага гандлю на надыходзячы 1929 год у шырокім разрэзе, то можна сказаць, што ў цэлым яны лепшыя, чым у пачатку мінулага году. У гэтым сэнсе яны могуць даць усе падставы для надзеі. «Буму» не чакаецца, да і жадаць яго ня трэба, але меркуючы па справаздачах спэцыяльных карэспандэнтаў, якія на даручэньні «Таймса» вывучылі становішча ў паных індустрыяльных цэнтрах, высьвятляецца, што сярод большай часткі прамысловцаў і камэрсантаў існуе **агульнае глыбокае прадчуваньне** добрага году» (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

І так, перад пачаткам крызісу глыбокадумныя эканамісты «Таймса» адзначалі «агульнае глыбокае прадчуваньне добрага году».

Цяпер возьмем, што пісаў «Таймс» праз год. Цытую артыкул «Зрок наперад», зьмешчаны ў гэтай газэце **1 студзеня 1930 г.:**

«... найлепшае новагоднае пажаданьне, якое мы можам сфармуляваць, зводзіцца да таго, каб у тэчэньні наступаючых месяцаў ў нашым грамадзкім жыцьці больш шырока ўцьвердзілі сабе надзвычайную важнасьць нацыянальнага характару. Агульнаўстаноўленым поглядам у гісторыі лічыцца, што нацыянальная велічь ніколі не захоўвалася на падставе адных толькі матар'яльных пераваг і што маральны заняпад немінучна зьяўляецца пролюдыяй да крушэньня».

І гэта даволі характарна.

Яшчэ праз год, **2 студзеня 1931 году** «Таймс» ужо вымушан гаварыць вельмі неспакойнай мовай. Вось што тады пісалася ў гэтай газэце ў артыкуле «Эўропа на раздарожжы»:

«У той момант, калі 1930 г. пераходзіць у 1931, на кантынэнце, нясумненна, панае ўсеагульнае пачуцьцё непакою і чаканьня, пэрвовае прадчуваньне зьмен і ўпэўненасьць у немінучасьці іх».

Нельга ня прызнаць, што буржуазныя вараціды з «Таймса» недарма занепакоіліся.

Яшчэ праз год яны прабуюць узяць сабе ў руки для таго, каб хоць як-небудзь яшчэ падтрымліваць свой аўтарытэт у асяродзьдзі чытаючай. У артыкуле «Год, багаты маг чымасьцямі», ад **2 студзеня 1932 году** «Таймс» пісаў:

«Калі-б уся справа зводзілася да дыягназу, то пералом у сусьветнай сытуацыі мог-бы наступіць ужо заўтра. На пачасьце для Англіі, яна **перайшла ўжо ад дыягназу да лячэньня»** (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

І так, год таму назад «Таймс» заявіў аб тым, што Англія «перайшла ўжо ад дыягназу да лячэньня». Значыцца, цяпер у студзені 1933 г. можна ўжо падагуліць некаторыя вынікі гэтаму «лячэньню».

Што-ж? Паглядзімо, што піша «Таймс» у студзені гэтага году.

2 студзеня 1933 году ў артыкуле «Са шчасьлівым новым годам» «Таймс», робячы весёлы твар, заяўляе:

«Што зусім нясумненна ў адносінах да 1933 г. — гэта тое, што прадстаіць багата труднасьцяй. Тым ня менш можна разумна чакаць «шчасьлівага новага году» ў тым сэнсе, што скончэньне яго можа суправаджацца пэўным прагрэсам у бок стабілізацыі міру і росквіту».

Але ў гэтым-жа артыкуле паны рэдактары з «Таймса» ня могуць сабе стрымаць і горкова заявляюць:

«Лёгка даравать людзям, якія адчуваюць нездаваленьне, а раздражненьне, чуючы запэўніваньні ў тым, што «мы нарэшце абагнулі кут» або «адлёг спыніўся». Такія гутаркі яны, паводле іх слоў, чуюць ужо некалькі год, і багацьце мэтафор не зьяўляецца кампэнсацыяй за жорсткую сапраўднасьць шамылак».

І ўжо зусім разьвязаўны язык, паны з «Таймса» даказваюць, што бягучы год «можа сапраўды быць выключна шчасьлівым годам, калі ён зможа прынесьці нам і нашым блізкім больш ясное ўяўленьне аб богу», з чаго «Таймс» робіць, нарэшце, наступны вывад:

«Наша выратаваньне ня было выкінута адной толькі людзкой мудрасьцю, прыпісаць-жа яго бясспрыкладнай сэрыі шчасьлівых выпадкаў — тэорыя, якую мысьлячыя людзі ня будуць схільны прыняць: «Да гэтага часу бог дапамагаў нам» — гэта фраза зьяўляецца больш правільным тлумачэньнем таго, што мела месца».

Сэнс гэтых разважаньняў аб богу, які «да гэтага часу дапамагаў», да нагляднасьці ясны. Гэтыя людзі ня вераць у блізкае палепшэньне сваіх спраў і таму пяском слоў «аб богу» стараюцца засыпаць вочы сваім чытачом. Яны тым больш проста могуць пэта рабіць, што атрымліваюць высокія аклады пэнсій на службе ў буржуазіі, якой, зразумела, таксама жывецца ня дрэнна і цяпер, ня гледзячы на найвялікшыя няшчасьці ў сярэдніх і нізкіх пластох насельніцтва, ня гледзячы на зьявішчае беспрацоўе ў рабочых.

Але даволі прагледзець указаныя вытрымкі з пісаньняў панаў, рэдагуючых цэнтральны орган ангельскай буржуазіі «Таймс», каб з элемэнтарных фактаў атрымаць прадстаўленьне аб тым, чаго варты іх асноўныя ацэнкі, прадказаньні і разважаньні на тэму аб эканамічным разьвіцьці Англіі і іншых капіталістычных краін. З гэтага відаць, што дрэнныя справы паноў **абаронцаў** капіталізму, але становішча гэтых спраў зусім адпавядае становішчу самога капіталістычнага ладу, давёўшага справу да нячуванага яшчэ крызісу і гаспадарчага развалу.

Паралельна тому, што гаварыла ангельская газэта «Таймс» я прывяду ацэнкі гаспадарчага становішча ў Злучаных Штатах, як гэтыя ацэнкі даваліся за прайшоўшыя чатыры гады на кім-небудзь з «безадказных» журналістаў, а адказнейшай асобай Злучаных Штатаў. Цікава, на самой справе, параўнаць марксыцкія ацэнкі бальшавікоў аб задачах гаспадарчага буданіцтва ў СССР на працягу прайшоўшай пяцігодкі і розьтаты работ бальшавікоў у СССР за гэтыя гады, — параўнаць з тым, што гаварылі і чаго дабіліся ў сваіх капіталістычных краінах паны буржуа і іх кіраўнікі, настолькі далёкія і чужыя марксыцкай навукі. Асабліва цікава паслухаць прадстаўніка буржуазіі самай багатай капіталістычнай краіны і такога вядомага глашатая капіталістычнага росквіту («праспэрыці»).

Пачну з таго, што гаварыла гэта асоба якраз у пачатку нашай першай пяцігодкі аб справах ПАЗШ. Тады якраз адбываліся прэзыдэнцкія выбары ў Амэрыцы, і кандыдаты ў прэзыдэнты па зразумелых матывах ня скупіліся на абяцаньні і на самаўсхваленьні. Тэй-жа асобай гаварылася **ў верасьні 1928 г.** наступнае:

«Калі мы (рэспубліканская партыя) сталі ў 1921 г. на чале ўраду, у краіне было ад пяці да шасьці мільёнаў беспрацоўных... На працягу году мы прадаставілі работу ўсім гэтым пяці мільёнам... Калі-б не разумная палітыка ўраду і не разумнае кіраўніцтва, становішча з працай у Амэрыцы зараз было-б такое-ж, як ва многіх іншых частках сьвету».

Прыкладна праз год, калі крызіс, які ўжо пачаўся, грамавым упарам пракаціўся па бэрках Паўночнай Амэрыкі, тая-ж асоба, як бышцам нічога не заўважыўшы, або прынамсі робячы такі выгляд, **25 кастрычніка 1929 г.** заявляла прадстаўніком просьб наступнае:

«Асноўнае дзелавое жыцьцё гэтай краіны (ПАЗШ), г. зн. прадукцыя і разьмеркаваньне грунтуецца на здаровым і **квітнеючым** фундаманце» (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

Ён заставаўся верным сабе, працягваючы правовы аб «праспэрыці», як быццам нічога асабліва ня здарылася.

Але што сёе-тое ўсё-ж пад канец 1929 году здарылася ў ПАЗШ, аб гэтым мы даведваемся крыху пазьней.

Першага мая 1930 г. ён ужо гаварыць наконт таго, што-ж іменна здарылася ў Амэрыцы ўвосень мінулага году, але, як прадстаўнік «праспэрыці», ён пачынае:

«Толькі шасьць месяцаў мінула з пачатку **краху,** і я перакананы, што самае дрэннае мы маем з-за, і што аб'ядноўчы нашы намаганьні, мы здолеем хутка адновіць гаспадарку» (падкрэсьлена мною — **В. М.**).)

Як бачыце, ён ужо павінен гаварыць аб эканамічным крызісе, як аб «крах у», але і далей заявляе: «мы здолеем хутка адновіць гаспадарку».

Што з гэтага атрымалася, зараз лепш відаць, але, перш чым на гэтым спыніцца, я падам яшчэ адну вытрымку з выступленьня тэй-жа асобы. Праз год пасьля паказанай вышэй правовы, **15 чэрвеня 1931 году** ён разьвіваў такі «амэрыканскі плян»:

«Я ў стане прапанаваць вам амэрыканскі плян. Гэты плян ахапляе павялічэньне адпачынку для мужчын і жанчын. Мы прапануем падняць пры дапамозе павукі і вынаходніцтваў жыцьцёвы ўзровень і дабрабыт усяго народу. Гэты плян павінен забясьпечыць лепшае разьмеркаваньне багацьця, зьмяншэньне беднасьці і значнае павялічэньне значнасьці».

Чаго толькі ў гэтым «амэрыканскім пляне» ня было наабяцана паўтары гады таму назад: і «павялічэньне адпачынку для мужчын і жанчын» і «лепшае разьмеркаваньне багацьця» і «зьмяншэньне беднасьці». Большага, здаецца, і жадаць нельга.

А што атрымалася на самой справе? А якія розьтаты?

Няхай ужо аб гэтым будзе сказана словамі ўсё таго-ж ангельскага «Таймса», які зусім нядаўна, 5 студзеня 1933 г., у перадавым артыкуле «Праблемы Амэрыкі» даў такую ацэнку становішча спраў у ПАЗШ:

«Ня гледзячы на вялізарныя залатыя скарбы ў банкаўскіх падвалах Н'ю-Ёрку, у Амэрыцы зараз знаходзіцца 38 проц. усяго залатога запасу 29 галоўных краін сьвету, там нагляднацца **галеча і беднасьць, якія ня ведаюць паралелі ў гісторыі Злучаных Штатаў** (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

І далей у тым-жа артыкуле спэцыяльна аб Н'ю-Ёрку:

«Звыш аднаго мільёну жыхароў **Н'ю-Ёрку,** якія складаюць адну трэць нармальнага рабочага насельніцтва горада і адну пастую ўсяго яго насельніцтва, знаходзяцца без работы і залежаць з таго моманту, як іх уласныя рэсурсы вычарпаны палкам ад публічнай і прыватнай добрачыннасьці. Уклю чаючы ўтрыманцаў аказваецца, што **адна трэць усяго насельніцтва гораду ахінута ніякам беспрацоўя»** (падкрэсьлена мною — **В. М.**).

Нарэшце, у тым-жа самым артыкуле даецца такая агульная характарыстыка становішча спраў у ПАЗШ:

«Зімой 1930-31 г. агульная колькасьць беспрацоўных у ГІ'ю-Ёрку вылічвалася ў **300 тыс.** чалавек, зімой 1931-32 г. — у **750 тыс.** чал., а зараз яна вылічваецца ў **1.150 тыс.** чалавек. Становішча становіцца яшчэ больш трывожным дзякуючы вычарпаньню ўсіх зьбераж эньняў, усеагульнаму зьбяднэньню і пагоршэньню гарадзкіх фінансаў. Другія буйныя амэрыканскія гарады знаходзяцца ў такім-жа дрэнным становішчы. Сельскім мясцовасьцям быць можа, прыходзіцца **яшчэ горш, бо ўсё фэрмэрскае насельніцтва даведзена да распачы,** а ва многіх частках краіны да **фактычнага руйнаваньня** ў рэзультаце бясконцага зьніжэньня таварных цэн. Тысячы і сотні тысяч людзей ператвараюцца ў **бяздомных бадзяг,** вандруючых па краіне ў пошуках работы, харчоў і прытулку. Няма падзейнай лічбы, характарызуючай гэту армію беспрацоўных, але нейкі карэспандэнт, які знаходзіцца ў асабліва спрыяючым становішчы для таго, каб меркаваць аб гэтым пытаньні, пісаў нядаўна, што без пераўвялічэньня па сёньняшні дзень **лік галодных і давядзеных да распачы** людзей, вандруючых уздоўж і ўпоперак Злучаных Штатаў можа быць акрэслен у поўмільёна. У гэты лік увяходзіць **шмат жанчын»** (усюды падкрэсьлівальні зроблены мною — **В. М.**).

Зразумела, у гэтым артыкуле ня ўсё сказана. Паны з «Таймса» умеюць замаўчаць гое, што ім невыгодна. Становішча ў ПАЗШ значна горшае, чым гэта гаворыцца ў «Таймсе». Але і паданых фактаў даволі для таго, каб даць належную ацэнку ўказаным шматлікім заявам і абяцаньням. Паданыя фэкты ў ПАЗШ зьяўляюцца-ж таксама сваёго роду вынікамі, разьвіцьця **самай багатай** капіталістычнай краіны якраз за той пэрыяд, калі ў СССР быў пэрыядам першай пяцігодкі. Параўнайце адны вынікі з другімі — вы вады напроставацца самі сабой.

З усяго гэтага відаць, у якім становішчы знаходзяцца працоўныя масы ня толькі ў Паўночнай Амэрыцы і ня толькі па астравох Вялікабрытаніі, а гэтыя краіны адносяцца да самых магутных капіталістычных краін,—але і ў іншых дзяржавах, дзе панае капітал. Мы павінны ведаць аб гэтых фактах, і, перш за ўсё, ведаць аб становішчы рабочых, бо рабочыя ўсіх краін — браты на клясе. Але самае горшае заключаецца ў тым, што і цяпер ніхто ня можа сказаць, што становішча працоўных мас капіталістычных краін ня будзе пагоршацца яшчэ далей. Усё гаворыць аб адваротным. Беспрацоўе ня толькі не скарачаецца, а ўзрастае; руйнаваньне сялян і фэрмэраў дзе не да скарачэньня, а да далейшага росту і поўным з кожным днём усё да большага.

Побач з вынікамі нас ня могуць ня цікавіць і **пэрспэктывы** разьвіцьця капіталістычных краін. Ня будзем гадаць наконт гэтага, паглядзім, як складуцца акалічнасьці. Для прадстаўленьня-ж аб магчымых пэрспэктывах разьвіцьця капіталістычнага сьвету ў даны момант вельмі карысна пазнаёміцца з тым, як прадстаўнікі буржуазных клясаў самі ацэньваюць становішча, якое стварылася да пачатку 1933 году. Я маю на ўвазе ня толькі выступленьні аддзельных асоб і друкаваных органаў. Возьму тое, што пададна было сказана наконт гэтага ангельскім урадам у ноце аб даўтах, накіраванай да ўраду Злучаных Штатаў. Вось некаторыя вытрымкі з гэтай ноты, апублікаванай у «Таймсе» 2 сьнежня 1932 году.

Першая вытрымка:

«Вайна выклікала глыбокія непарадкі ў міжнародным гандлі і праз 14 год гэтыя непарадкі выліліся ў крызіс нябываламу вострасьці. Яны выявіліся ў агульным паралізаваньні гандлю на ўсім цывілізаваным сьвеце, з шырокім распаўсюджаньнем беспрацоўя і бядотным падзеньнем нацыянальных даходаў ва ўсіх краінах, у тым ліку ў ПАЗШ і ў Вялікабрытаніі.

Прычыны дэпрэсіі могуць быць рознастайны, але агульна прызнана, што ваенныя даўгі (да рэчы сказаць, з гэтага лішні раз відаць, як сваячасова мы ад іх вызваліліся! — **В. М.**) і рэпарацыі зьявіліся адной з галоўнейшых прычын і што ўрэгуляваньне гэтых даўгоў, якое вызваліць сьвет ад раду, зьвязаных з імі пагроз, зьяўляецца немінучай умовай адзяўленьня агульнага росквіту».

Другая вытрымка з ангельскай ноты:

«З таго часу сьвет жыве над ударамі, якія ўсё паўтараюцца і канчаткова падарвалі тое давер'е, на якім грунтавалася сыстэма прыватнага інвэставаньня. Працэс разлажэньня дайшоў да таго пункту, калі ён пераатварыўся ў спробу ліквідаваць ня толькі прыватныя капіталы і прадпрыемствы, але і цэлыя краіны. Нацыянальным валютам пагражае няўстойлівасьць, калі ня поўны крах, а меры рэстрыкцыі і кантролю, меўшыя мэтай палегчыць труднасьці, прывялі толькі да абвастрэньня такавых. Усюды падатковае абкладаньне бальшэйшае павялічана, а расходы жорстка скарочаны, і тым ня менш бюджэты дэфіцытны або зводзяцца ўсё з большымі труднасьцямі. Ва ўсіх напрамках заўважваюцца прыметы параліжаваньня гандлю і пагроза банкрутства і фінансавага краху. Міжнародны грашовы мэханізм, без якога сучасны сьвет ня ў стане эфэктыўна існаваць, разьбіт на кавалкі, што цягне за сабою рознастайныя формы бядот і няшчасьця. Усе краіны сьвету ня могуць нават прыступіць да разгляду пытаньня аб адпаўленьні гэтага мэханізму да таго часу, пакуль ня зьнішчаны прычыны, якія падрываюць давер'е».

Трэцяя вытрымка з тэй-жа ноты:

«Па прычынах, падзных у папярэдніх параграфах, урад яго вялікасьці грунтуе сваю просьбу аб перагляде ўсяго становішча, якое стварылася, на тым факце, што выплата ваенных даўгоў, па яго думцы, аказалася несумяшчальнай з існуючай эканамічнай арганізацыяй сьвету і што ўсякае адпаўленьне гэтых плацяжоў асуджана цяжка абвастрыць існуючы крызіс і раканым чынам скампрамэтаваць усе спробы процідзеяньня крызісу».

Тут няма патрэбы спыняцца на ацэнцы гэтай ноты па сутнасьці, але, з пункту гледжаньня апісаньня становішча спраў у капіталістычным сьвеце, ангельская нота — даволі яркі дакумэнт. Весь і меркуйце самі аб пэрспэктывах капіталістычных краін.

Недарма цэнтральны орган францускай буржуазіі «Тан» 1-га студзеня гэтага году заяўляе ў перадавым артыкуле:

«Кругавід сумны, але ня трэба траціць надзеі... На працягу гэтага году вярыцьцялям лёсаў прыдзецца вырашыць найвялікшую з усіх задач, якую калі-небудзь прыходзілася вырашаць адказным урадам: а іменна выратаваць нашу цывілізацыю, якая знаходзіцца ў небясьпецы».

Цяпер ня мала пражэкцёраў у «цывілізаваных» краінах капіталізму, якія займаюцца ўсякага роду вынаходніцтвам выхадаў з крызісу. Адны марыць аб дыктатурах, другія —аб карпарацыйнай дзяржаве фашысцкага тыпу, трэція — аб «тэхнократы», г. зн. аб перадачы ўлады ў рукі інжынэрства. На сусьветнай эканамічнай канфэрэнцыі, якая склікаецца ў бліжэйшы час, пакольві аб гэтым можна меркаваць па патрыхтоўчай рабоце так званых экспэртаў буржуазных краін, спыняцца асабліва ня прыходзіцца. У нас ёсьць свая думка наконт усіх гэтых «плянаў» і наконт сапраўднага выхаду са становішча.

У даны момант гэта думка, угрунтаваная шматлікімі фактамі гістарычнага значэньня, пацьвярджаецца з выключнай сілай як вынікамі першай пяцігодкі, так і самым планам **новых** работ на 1933 г. План першага году другой пяцігодкі нельга не разглядаць, як увасабленьне перамогі першай пяцігодкі.

Даволі указаць на асноўныя заданьні гэтага пляну — пляну, які мы павінны выканаць і выканаем! — каб пераканацца ў гэтым. Асабліва павучальна параўнаць гэты плян, які акрэсьлівае пэрспэктывы далейшага шпаркага ўзьдыму СССР, з указанымі ўжо пэрспэктывамі разьвіцьця капіталістычных краін.

План прадугледжвае павялічэньне прадукцыі прамысловасьці на 16,5 проц. Зазначэньне, як бачыце, сур'ёзнае. А што мы бачым у капіталістычных краінах? Няхай пададуць хоць-бы **адзін** прыклад, хаця-б **адну** краіну капіталізму, дзе ў 1933 г. можна разьлічваць ня то, што на 16, а хаця-б на 6 проц. росту прадукцыі прамысловасьці! Затое значна больш магчыма, што многія з капіталістычных краін і ў гэтым годзе ня толькі ня змогуць падняць сваёй прамысловасьці, а пакоцяцца ё далей в горкі.

План памячае далейшы рост заработнай платы рабочых прамысловасьці на 9 проц. І гэта ня гледзячы на тое, што ў папярэдня гады заработная плата рабочых у СССР таксама з году ў год павялічвалася. А якавы пэрспэктывы заработнай платы рабочых у краінах, дзе панае буржуазія? Нешта ня чуваць аб тым, каб хоць у адной буржуазнай рэспубліцы або буржуазнай манархіі (рознасьць тут нязістотная) паны капіталісты намячалі павышэньне заработнай платы рабочых. Няхай нам прывядуць хоць-бы **адзін** такі прыклад, хоць-бы **адну** такую краіну!

План ставіць задачу сур'ёзнага павышэньня ўраджайнасьці на ўсіх сельска-гаспадарчых культурах. Гэта для Савецкага саюзу асабліва патрэбна. А хіба гэтай справай, справай павышэньня ўраджайнасьці, займаюцца ўрады капіталістычных дзяржаў? Няхай цывілізуць нам хоць-бы **адзін** прыклад, хоць-бы **адну** краіну, дзе буржуазныя ўлады клапоцяцца аб падняцьці ўраджайнасьці сялянскіх палёў!

У справе культурнага будаўніцтва планам прадугледжваецца выдаткаваньне многіх буйнейшых сродкаў як па лініі ліквідацыі пісьменнасьці, так і па лініі ўзмацненьня падрыхтоўкі навукова-тэхнічных кадраў і разгортваньня навукова-дасьледчай работы ў цэнтры і ва ўсіх раёнах СССР. Ці ёсьць што-небудзь падобнае ў даны момант у капіталістычных дзяржавах? Да нас даходзіць усё больш вестак аб фактах процілеглых.

3. АБ УЛАСНАСЬЦІ БУРЖУАЗНАЙ І АБ УЛАСНАСЬЦІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ

Асабліва паказальна тое, што ў СССР, пры ўсёй розьніцы гаспадарчых і нацыянальных укладаў жыцьця шматлікіх рэспублік і раёнаў, ва ўсіх частках Саюзу ідзе няўхільны гаспадарчы і культурны ўзьдым, і ў той-жа час ва ўсіх капіталістычных краінах, малых і вялікіх, ідзе адваротны працэс, працэс упадку і ў некаторых адносінах — простага гніцьця. Зразумела, таму, што гутаркі аб «арганізаваным капіталізьме», такія папулярныя яшчэ тры-чатыры гады таму назад, цяпер спыніліся зусім. Усякага роду дасьледчыкі і дасьледчыя камітэты з буржуазнага лягеру займаюцца безнадзейнымі пошукамі спосабаў устанаўленьня так званай «роўнавагі» ў гаспадарцы, але ўсе гэтыя патугі настолькі незначныя, што можна на гэтым асабліва і ня спыняцца. З другога боку, народна-гаспадарчы плян 1933 г. ставіць перад намі новыя і прытым буйнейшыя задачы ў галіне арганізацыі сацыялістычнай гаспадаркі. Трудасьцяй гэтай справы мы ня толькі ня збіраемся пераўмяншаць, але, наадварот, на іх мы і павінны сканцэнтраваць галоўную увагу з тым, каб па-бальшавіцку іх перамагчы.

Чаму пытаньні арганізацыі сацыялістычнай гаспадаркі павінны цяпер патрабаваць да сябе асаблівай увагі да савецкай улады? Адказ на гэта пытаньне просты і ясны: ды іменна таму, што сацыялізм перамог, што ў нашай краіне сацыялістычныя формы сталі пануючымі формамі гаспадаркі. І з гэтага мы павінны зрабіць адпаведныя вывады ў адносінах да ўсёй практычнай работы.

Мы ўжо зрабілі ў канцы мінулага году адзін агульны і рашаючы вывад. Гэта праявілася ў выданьні дэкрэту савецкага ўраду «Аб ахове маемасьці дзяржаўных прадпрыемстваў, калгасаў і кааперацыі і ўмацаваньні грамадзкай (сацыялістычнай) уласнасьці». Марксызм вучыць нас таму, што пытаньне аб уласнасьці мае рашаючае значэньне для сутнасьці дзяржаўнага ладу. Аб гэтым трэба асабліва памятаць цяпер, калі ў адносінах уласнасьці на сродкі вытворчасьці ня толькі ў горадзе, але і ў вёсцы, дзе жыве пераважная маса нашага насельніцтва, адбыліся за апошнія гады карэнныя перамены, і ў нашай гаспадарцы канчаткова запанаваў пануючае становішча дзяржаўна-сацыялістычныя і грамадзка-калгасныя формы.

Гэтым дэкрэтам у розгорнутай форме над кроеьлваецца найгнабейшая прыцьцяжная розьніца паміж уласнасьцю **буржуазнай** і уласнасьцю **сацыялістычнай.**

Клясычная буржуазная рэвалюцыя, француская рэвалюцыя 1789-93 г. г. дала першаклясны дакумант аб значэньні буржуазнай уласнасьці для краін з капіталістычным рэжымам. У гэтых адносінах навучальнейшым дакумантам зьяўляецца вядомая «Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзянина», прынятая Нацыянальным Сходам Францыі ў 1789 г. Гэта дэкларацыя складалася з 17 пунктаў, з якіх я абвяшчу два першыя і апошні. Вось якімі прыгожымі фразамі пералоўнена гэта «Дэкларацыя»:

«1. Людзі нарадзіваюцца і заставаюцца свабоднымі і роўнымі ў правах. Грамадзкія розьнасьці могуць быць заснаваны толькі на агульнай карысьці.

2. Мэта ўсякага палітычнага саюзу ёсьць захаваньне натуральных і неадчужаемых правоў чалавека. Правамі гэтымі зьяўляюцца: свабода, уласнасьць, бясьпечнасьць і супраціўленьне прыгнёту».

А для таго, каб не пакідаць нікіх сумненьняў наконт асноўнага пытаньня, наконт пытаньня аб уласнасьці, «Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзянина» канчаецца наступнымі словамі:

«З тае прычыны, што ўласнасьць ёсьць недатыкальнае і сьвяшчэннае права, дык ніхто ня можа быць яе пазбаўлены, апрача тых выпадкаў, калі гэтага відавочна вымагае грамадзкая патрэба, законна засьведчаная, і пад умовай справядлівай і папярэдняй узнагароды».

І так, «Дэкларацыя правоў чалавека і грамадзянина» робіць сваёй асновай прыватную ўласнасьць, г. зн. уласнасьць заснаваную на эксплёатацыі адных людзей другімі людзьмі, абвяшчаючы яе «недатыкальным і сьвяшчэнным правам» «чалавека і грамадзянина». У гэтым і заключаецца сапраўдны дух буржуазнай дзяржавы.

З таго часу гісторыя пашла далёка наперад. Кастрычніцкі пераварот 1917 г. быў пачаткам сацыялістычнай рэвалюцыі, значнае якой пашыраецца далёка за межы адной краіны. Гэта відаць, апрача ўсяго іншага, з «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплёатаванага народу», прынятай яшчэ ў пачатку 1918 г. III Усерасійскім Зьездам Саветаў. Новы, савецкі лад знаходзіць у гэтай дэкларацыі, напісанай рукой **У. І. Леніна,** сваё яркае выяўленьне. У «Дэкларацыі правоў працоўнага і эксплёатаванага народу» гаворыцца наступнае:

«Ставячы сваёй асноўнай задачай зьнішчэньне ўсякай эксплёатацыі чалавека чалавекам, поўнае зьнішчэньне падзелу грамадзтва на клясы, безжалітаснае задушэньне эксплёататараў, устанаўленьне сацыялістычнай арганізацыі грамадзтва і перамогі сацыялізму ва ўсіх краінах, III Усерасійск. Зьезд Саветаў рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў пастанаўляе далей:

а) У ажыцьцяўленьне сацыялізацыі зямлі прыватная ўласнасьць на зямлю скасоўваецца і ўвесь зямельны фонд абвяшчаецца агульна-народным здабыткам і перыходзіць працоўным без усякага выкупу...

б) Усе лясы, нэдры і воды агульнадзяржаўнага значэньня, а таксама ўвесь жывы і мёртвы інвэнтар, узорныя прадпрыемствы абвяшчаюцца народным здабыткам.

в) Як першы крок да поўнага пераходу фабрык, заводаў, рудніноў, чыгунак і іншых сродкаў вытворчасьці і транспарту ва ўласнасьць Савецкай Рабоча-Селянскай Рэспублікі, пацьвярджаецца савецкі закон аб рабочым кантролі...» (усюды падкрэсьленьні зроблены мною — **В. М.**).

Я ня буду цытаваць далей гэты дасканалы дакумант Кастрычніцкай рэвалюцыі. І з прыведзенай вытрымкі сёе яго ясны.

Характэрна ўжо тое, што першая буржуазная дэкларацыя правоў гаворыць аб правах чалавека і грамадзянина, а другая, савецкая, гаворыць аб правах працоўных і эксплёатаванага народу. Гэтым падкрэсьліваецца, што ў аснове буржуазнага ладу, які абвяшчаўся «Дэкларацыяй правоў» 1789 году, ляжыць прыватная ўласнасьць, а ў аснове нашага, савецкага ладу — грамадзкая ўласнасьць. У гэтым, перш за ўсё, і заключаецца прынцыпальнасьць гэтых двух грамадзкіх рэвалюцый.

Але тое, што наша дэкларацыя 1918 г. толькі намячала, як сваю асноўную задачу, а іменна пераход сродкаў вытворчасьці ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі ў грамадзкую ўласнасьць, тое па-сапраўднаму было выпрацана толькі ў апошнія гады. Вось чаму толькі ў канцы першай першай пяцігодкі стала магчымым выданьне дэкрэту аб сацыялістычнай (грамадзкай) уласнасьці.

Гэты дэкрэт, напісаны тав. **Сталіным,** ставіць з усёй прынцыповай выразнасьцю пытаньне аб грамадзкай уласнасьці ў Савецкім саюзе. Вось што ў ім гаворыцца:

«Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў Саюзу ССР, лічаць, што грамадзкая ўласнасьць (дзяржаўная, калгасная, кааперацыйная) зьяўляецца асновай савецкага ладу, яна сьвяшчэнна і недатыкальна, і людзі, якія робяць замах на грамадзкую ўласнасьць, павінны разглядацца, як ворагі народу, у сувязі з чым рашучая барацьба з раскрадальнікамі грамадзкай маемасьці зьяўляецца самым першым абавязкам органаў Савецкай улады».

У адрозьненьне ад дэкларацыі канца XVIII стагодзьдзя дэкрэт 7-га жніўня 1932 году абвяшчае «сьвяшчэннай і недатыкальнай» грамадзкую ўласнасьць, г. зн. уласнасьць дзяржаўную, калгасную і кааперацыйную, а робячы замах на яе абвяшчае «ворагамі народу». Пасьля гэтага зразумела, што аховы і ўмацаваньне дзяржаўнай і кааперацыйна - калгаснай уласнасьці, якая зьяўляецца «асновай савецкага ладу», павінны стаць у нас на першым месцы. Гэту «ахову» плюс «умацаваньне» сацыялістычнай (грамадзкай) уласнасьці мы іншымі словамі і называем будаўніцтвам сацыялізму. Наша задача заключаецца ў тым, каб **уся** маса працоўных усьведамляла значэньне аховы і ўмацаваньня грамадзкай уласнасьці і каб **усе** нашы арганізацыі і пасобныя работнікі навучыліся весьці практычна барацьбу за гэту справу.

У чым заключаецца сэнс таго, што адбываецца ў СССР, пачынаючы ужо разумець і шаноўныя буржуазныя прафэсары. Вось, напрыклад, што піша да бальшавізьме вядомы германскі прафэсар Ота Гетч у толькі што выпаўшай кнізе «Сутнасьць і міжнароднае становішча СССР»:

«Гэта ў мяне ня нова складзенае перакананьне. Але ніколі яно мне не ўяўлялася такім відавочным, як з часу маёй апошняй паездкі ў Расію ў мінулым годзе. Ніколі раней я ня выносіў такога яснага адчуваньня, што ў бальшавізьме, у яго ідэалёгічных асновах і ў гігантскіх спробах пратваранньня яго ў жыцьцё справа ідзе перш за ўсё і галоўным чынам аб вялікай барацьбе ідэй, якая разгортваецца перад усім сьветам».

Нельга не згадзіцца з прафэсарам, што справа сапраўды ідзе аб «вялікай барацьбе ідэй», але калі гаварыць аб простых сьмяротных, а не аб прафэсарох, дык цяпер ужо ня толькі мільёнам, а дзесяткам мільёнаў людзей стала ясна, што ў гэтай «вялікай барацьбе ідэй» перамагае бальшэвізм.

Сваёй перамогі рабочая клясы СССР дасягнула ў рэзультаце правільнага кіраўніцтва УсеКП(бальшавікоў) і ў рэзультаце яе пасьляўпэўнай і бязьлітаснай барацьбы як з «левым», так і асабліва з правым апартуністамі. Нашы перамогі атрыманы пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК, на чале з правадыром партыі і рабочай клясы тав. **Сталіным. (Шумныя, доўгія аплёдысмэнты).**

ПРАЦЯГ ДАКЛАДУ тав. МОЛАТАВА

сыці паўную школу практычнай работы, каб у шырокім маштабе рэалізаваць для сацыялістычнага будаўніцтва створаныя ў нашай краіне гэтых новых кадраў.

Вось чаму для другой пяцігодкі, і асабліва для яе першых двух-трох год, тэмпы росту прамысловай прадукцыі павінны быць узяты некалькі меншыя, чым закладзёныя намі тэмпы ў першай пяцігодцы. У гэтым адрозненні ніякіх прынцыпіальных задач ад першай пяцігодкі. У адпаведнасці з гэтым галоўны ўпор павінен быць перанесены з колькаснага росту прадукцыі на паляпшэнне якасці прадукцыі і рост прадукцыйнасці працы ў прамысловасці, з пашырэння пасеўных плошчаў на рост ураджайнасці ў земляробстве і паляпшэнне якасці работы ў сельскай гаспадарцы. Усё гэта патрабуе таго, каб арганізацыя сацыялістычнай гаспадаркі была ўзнята на новую, больш высокую ступень. Без усялякага паляпшэння ўсёй справы арганізацыі гаспадарчай работы, усіх яе галін, і асабліва рашаючых раёнаў і вучасткаў, нельга справіцца з планам 1933 году. А гэта значыць, што работа пастарому цяпер ніяк ня выйдзе.

Але лёгка сказаць — увялаць гаспадарчую работу на новую, больш высокую ступень. Выканаць гэта ня так проста. Каб выканаць, трэба пераламаць многія дрэнныя прывычкі ў рабоце з масамі, у арганізацыі працы на прадпрыемствах, ва ўстанаўленьні належнага парадку ва ўсіх органах кіраўніцтва.

У нашых умовах гаспадарчая работа мае тысячы палітычны характар. Таму партыя і раней імкнулась накіроўваць на гаспадарчую работу лепшыя свае кадры. У гэтым годзе, у сувязі з новымі больш складанымі задачамі народна - гаспадарчага плану, адказнасць гаспадарчых кіраўнікоў значна ўзрастае.

І ў колькасных адносінах задачы сацыялістычнага будаўніцтва бягучага году значна вышэй таго, што мы выканалі ў мінулым годзе, але савецкая ўлада пераносіць пры гэтым цяпер цяжару на выкананьне такіх заданьняў, як павышэньне прадукцыйнасці працы ў прамысловасці і на транспарце і павышэньне ўраджайнасці ў земляробстве, а гэтага нельга дасягнуць бяз якаснага паляпшэньня ўсёй нашай работы. Для гэтага трэба яшчэ ў большай ступені абапірціся на падтрыманьне мас і, у першую чаргу, на падтрыманьне ўдарнікаў і ўдарніц нашай будоўлі. Трэба ўмець растлумачыць рабочым і калгасьнікам шлях нашага будаўніцтва, а для гэтага падыйсьці яшчэ бліжэй да мас. Неабходна на справе даказаць, што мы зрабілі крок наперад, як практычныя арганізатары вытворчасьці на заводах і фабрыках, у калгасах і саўгасах, на транспарце і ў будаўніцтве, трэба яшчэ больш зацягваць на выкананьне галоўных задач асноўную масу рабочых і працоўных сялян, даць прыклады сапраўднага палепшэньня справы арганізацыі працы, а, значыцца, і правільнай расстаноўкі сіл і пастаяннай дзелавой праверкі выкананьня прынятых пастаноў. Такой работай мы забясьпечым новы прыліў энтузіязму ў масах і той пафас, які так уласцівы сацыялістычнаму будаўніцтву і які зараз так патрэбен як на будоўлях, так і асабліва ў вытворчасьці, ва ўсіх нашых прадпрыемствах.

З гэтага трэба рабіць вывік аб асноўных задачах нашых гаспадарнікаў, а таксама работнікаў прафсаюзаў і іншых арганізацый. Трэба яшчэ памятаць аб тым, што час ляціць хутка, а разварушаемся мы марудна. Між тым, справа тут ідзе аб актыўнасьці шматтысячных кадраў гаспадарчых, прафсаюзных і іншых, аб мільёнах рабочых і аб дзесятках мільёнаў калгасьнікаў і працоўных адпаасобных сялян.

Хто забудзе пры гэтым аб неабходнасьці ўзмацненьня барацьбы з рашткамі варожых нам клясаў, хто забудзе аб тым, што яшчэ і зараз антысавецкія сілы нярэдка знаходзяць сабе прыдулак у нашых прадпрыемствах і ўстановах, адкуль яны гатовы ўсялякі разлогаць асобныя праслойкі працоўных і ўсімі даступнымі ім спосабамі паскудзіць і шкодзіць нам, — той пасгул ня спраўдзіцца з даручанай яму справай.

Без рэвалюцыйнай пільнасьці і ўсямернага ўзмацненьня барацьбы з контр-рэвалюцыйнымі элементамі нельга ацушыць нашай справы наперад, асабліва ў цяперашняй абстаноўцы. Толькі буржуазныя перарожэнцы, якія на справе знаходзяцца ў палоне ў нашых ворагаў, заплюшчваюць вочы на гэтыя факты.

Гэтаму вучыць нас партыя, пад кіраўніцтвам якой толькі і можа ісьці пераможнае будаўніцтва сацыялізму. З гэтага павінны выходзіць арганізатары савецкага, гаспадарчага, кааперацыйнага і калгаснага будаўніцтва, кіраўнікі прафсаюзных арганізацый і ўсе іншыя практычныя работнікі сацыялістычнай будоўлі.

У галіне **прамысловасці** галоўная задача ў павышэньні прадукцыйнасьці працы. Павысіць прадукцыйнасьць працы, зьнізіць сабекошт і палепшыць якасьць прадукцыі гэта — асноўнае. Пляшам задача павышэньня прадукцыйнасьці працы і зьнижэньня сабекошту пастаўлена зусім канкрэтна для кожнай галіны прамысловасьці — цяжкай, лёгкай, харчовай, лясной. Трэба, уласна, гаварыць не наогул аб павышэньні прадукцыйнасьці працы, а **аб разьмерах** гэтай задачы і **часе** яе ажыцьцяўленьня, пры чым у адпаведнасьці з планам для **кожнай** галіны прамысловасьці, для **кожнага** тросту, для **кожнага** прадпрыемства. Час усё ж ад агульных разважаньняў бліжэй падыйсьці да практычных мер. А тут якраз і заключаецца наша галоўная **слабасьці**. Пакуль мы прымаем рэзалюцыі, пакуль мы гаворым прамовы, пакуль мы распрацоўваем праекты і ўказаньні, у нас праходзіць шмат часу, а час, г. зн. тэмпы, для бальшавікоў маюць рашаючае значэньне.

Калі дзе асабліва трэба паскорэньніць задачу работы ў масах, неабходнасьць узмацненьня сьвядомасьці і актыўнасьці рабочых, дык гэта іменна ў пытаньні аб прадукцыйнасьці працы. Нельга павысіць прадукцыйнасьці працы, зьнізіць сабекошт, скараціць рашуча брак і зьнізіць якасьць прадукцыі без таго, каб не пабудзіць актыўнага і сапраўды ўзмоцненага падтрыманьня рабочых. Значыцца, у арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва нам трэба навесьці справу лепш, больш сур'ёзна. Між тым, штосьці мала чуваць аб узмацненьні актыўнасьці нашых гаспадарчых органаў і прафарганізацый у гэтых адносінах. Магчыма, што ў канцылярыях і пачалася ўжо тая ці іншая работа на частку складаньня новых праектаў і выпрацоўкі новых распараджэньняў, але справа-ж ня ў гэтым. Сутнасьць справы заключаецца ў практычнай жывой рабоце. Для гэтага неабходна, каб нашы прадпрыемствы дакладна ведалі пастаўленыя перад іх заданьні, каб аб гэтым добра ведалі і рабочыя фабрык, заводаў, капальняў і майстэрань, каб у расстаноўцы гаспадарчых і тэхнічных кадраў было забясьпечана сур'ёзнае паляпшэньне справы, каб праверка іх работ ня зводзілася да фармальных запытаньняў і адпісак, каб, адным словам, работа ішла не бюракратычна. А няма чаго граха таіць, што па частцы бюракратызму, цеганіны і практычнай бесцападзежнасьці хапаюрых на шых гаспадарчых арганізацый мы маем у некаторых выпадках сапраўдныя «дасягненьні». Вось з гэтымі жарам агідным «дасягненьнямі» і павінна быць асабліва ўзмоцнена барацьба.

Выкананьне заданьняў па паляпшэньні прадукцыйнасьці працы зараз у вялізарнай мерэ палегчана дасягнутым ужо значным укараненьнем тэхнічнай базы нашай прамысловасьці. Трэба толькі здолець зрабіць хаця-б адзін буйны крок наперад у справе авалодваньня тэхнікай, у справе асваеньня новага абсталяваньня, у справе паляпшэньня гаспадарча-тэхнічнага кіраўніцтва новымі і рэканструяванымі заводамі і фабрыкамі, а таксама ліквідацыяй бяспорадку ў гаспадарцы, і ўсе гэтыя мэты можна ня сумневацца ў тым, што пераважная маса рабочых у гэтым нас цалкам падтрымае і будзе гарой стаяць за самыя суровыя меры супроць антысавецкіх, шкодніцкіх элементаў.

Ёсьць яшчэ адно пытаньне, пытаньне аб цяпучасьці рабочых. Партыяй і ўрадам прынятыя за апошні час усе неабходныя меры для таго, каб дабіцца карэннага аздараўленьня ў адносінах цяпучасьці ў 1933 г. Зараз справа, галоўным чынам, за мясцовымі арганізацыямі — гаспадарчымі, прафсаюзнымі і іншымі.

Такім чынам, уся справа будзе залежаць ад таго, наколькі мы здолеем **арганізаваць** работу. Тое-ж самае трэба сказаць і адносна прамысловага і другога будаўніцтва.

Значэньне практычных пытаньняў у галіне **будаўніцтва** вызначаецца ўжо тым, што ў гэтым годзе мы ўкладаем у капітальныя работы на ўсёй нашай гаспадарцы 18 млрд. руб., г. зн. некалькі больш мінулага году. Галоўныя ўкладаньні ідуць, зразумела, на лініі прамысловасьці і, перш за ўсё, на лініі асноўных будоўляў — мэталургіі, машынабудаўніцтва, аналавай прамысловасьці, хэміі, электрабудаўніцтва, а таксама лёгкай прамысловасьці і чыгуначнага транспарту. У адносінах кошту будаўніцтва за апошні час справа стаіць асабліва кепска. У гэтым годзе пастаўлена задача зьніжэньня сабекошту будаўніцтва ня менш, чым на 15 проц. Справа-гэта даволі цяжкая, але пасільная і ва што-б там ні стала павінна быць ажыцьцёўлена.

У сувязі з гэтым я павінен падкрэсьліць той факт, што за апошнія тыдні праведзена поўная работа на паляпшэньні арганізацыі вырабу будаўнічых матар'ялаў. Сэнс гэтай работы заключаецца ў забясьпячэньні бязумоўна ўстойлівых цэн на будматар'ялы, а так сама ва ўмацаваньні тэхнічнай, вытворчай і транспартнай базы прамысловасьці, вырабляючай будматар'ялы, і ў адпаведным рэгуляваньні цэн на гужавым транспарце на мясцох. Трэба дабіцца, каб гэтыя рашэньні былі праведзены ў жыцьцё і, перш за ўсё, у асноўных раёнах індустрыяльнага будаўніцтва.

У адносінах **сельскай гаспадаркі** савецкай уладай праводзіцца рад мер, накіраваных да далейшага яе ўздыму і, у першую галаву, да павышэньня ўраджайнасьці. Справа зараз не ў папырэньні пасеўных плошчаў. Тут мы ўжо зрабілі ня мала. Затое ў адносінах ураджайнасьці ў нас рад слабых участкаў. На ўздым ураджайнасьці калгасных і саўгасных палёў мы павінны зрабіць упор у нашай рабоце ў вёсцы. Трэба таксама па-сапраўднаму ўзяцца за разьвіцьцё жывёлагадоўлі, для чаго зараз мы ўжо маем сур'ёзную сацыялістычную базу ў асобе жывёлагадоўчых саўгасаў і жывёлагадоўных таварных калгасных ферм.

Апублікаваная нядаўна пастанова Саўнаркому і ЦК УсеКП(б) «аб абавязковай пастаўцы збожжа дзяржаве калгасамі і адпаасобнымі гаспадаркамі» мае вялікае палітычнае значэньне. Гэтым дэкретам скасоўваецца існаваўшая дагаворная (кантрактацыйная) сыстема загатовак збожжавых культур і ўстанаўліваецца для калгасаў і адпаасобных гаспадарак, у парадку падатку, цьвёрдыя абавязацельствы па здачы збожжа дзяржаве па ўстаноўленых дзяржавай цэнах і поўных сярэдніх кравых і рэспубліканскіх пагектарных нормах. Гэта мерапрыемства праведзена пасьля вопыту з устанаўленьнем такога-ж парадку загатовак мяса, а таксама масла і малака. Як новыя мэтады загатовак мяса, так і новыя загатовак збожжа ў парадку абавязковай пастаўкі дзяржаве будуць спатканы з поўным падтрыманьнем калгасьнікамі і працоўнымі адпаасобнікамі. Гэтым шляхам дзяржава зможа забясьпечыць сябе неабходнымі запасамі збожжа ад новага ўраджаю, і разам з тым стварэцца новая, дадатковая прапасьлі для павышэньня ўраджайнасьці збожжавых культур, чаму, у прыватнасьці, будзе спрыяць указанае дэкрэту на тое, што «ўсе ліпкі збожжа пасьля выкананьня абавязацельстваў здачы дзяржаве збожжа застаюцца ў поўным распараджэньні саміх калгасаў, калгасьнікаў і адпаасобнікаў».

Як ніколі трэба ўзяцца за справу павышэньня прадукцыйнасьці працы ў сельска-гаспадарчай вытворчасьці, в асаблівай наглядзнасьці пакажае пастанова Саўнаркому і ЦК УсеКП(б) па Паўночным Каўказе, якая будзе апублікавана заўтра.

Нерахоны нашай работы на вёсцы весьні сур'ёзна адбіліся на Паўночным Каўказе. Між тым, гэты буйнейшы збожжавы раён, у якім арганізованае правядзеньне пасеўнай кампаніі мае ў гэтым годзе асаблівае значэньне.

У пастанове дакладна ўказваецца, на якіх практычных задачах павінны сканцэнтраваць сваю ўвагу паўночна-каўкаскія арганізацыі. Пры гэтым Саўнарком і ЦК падкрэсьліваюць неабходнасьць цьвёрдай працоўнай дысцыпліны ў калгасах, рашучай барацьбы з кулацкім сабатажам і шкодніцтвам як у часе збору насеньня, так і ў часе сяўбы і асобна ўказваюць на небясьпеку шкодніцкіх спроб зьмяншэньня норм высеву і шкодніцкага правядзеньня ворыва з мэтай псаваньня палёў і зрыву ўраджаю, супроць чаго павінны быць прынятыя самыя рашучыя меры на аснове дэкрэту аб ахове прамаўкай уласнасьці. Адпаасобнікі таксама павінны выканаць абавязковы для іх цьвёрды плян пасеву. Для правядзеньня ўсіх гэтых мер створаецца камітэт па весняной сяўбе на Паўночным Каўказе пад старшынствам сакратара крайкому тав. Шабанова. Гэты камітэт надзяляецца ўсімі неабходнымі правамі для забясьпячэньня пасыяховага правядзеньня сяўбы.

Вітаючна, што ў розе іншых раёнаў арганізаваецца ў правядзеньні такіх задач, як зьнішчэньне пустазельля, недапушчэньне спазьненьня ў сяўбе, скарачэньне тэрміну сяўбы і сапраўднае паляпшэньне якасьці апрацоўкі зямлі пры поўным выкананьні пасеўнага плану, маюць самае актуальнае значэньне. І таму арганізацыя весняной сяўбы на Паўночным Каўказе можа паслужыць для іх прыкладам, асабліва, калі паўночна-каўкаўцы правяць ва ўсёй гэтай рабоце належную актыўнасьць і арганізаванасьць.

Пастанова СНК і ЦК лішні раз падкрэсьлівае, што зараз перад намі, камуністамі, сталі **новыя**, больш складаныя задачы і ў сельскай гаспадарцы. Ніколі яшчэ ў такой меры пасеўная кампанія не залежала ад посьпехаў савецкай і партыйнай работы, як у гэтым годзе. Інакш і ня можа быць цяпер, калі сацыялістычныя формы пануюць у сельскай гаспадарцы. А кіраўніцтва ў адносінах сацыялістычных форм можа ажыцьцяўляцца толькі органамі савецкай улады на аснове бальшавіцкай палітыкі. Пытаньні **арганізацыі** і практычнага **кіраўніцтва** ня могуць цяпер не стаяць у цэнтры нашай увагі ў сельскай гаспадарцы, дзе ад вырашэньня такіх задач, як павышэньне ўраджайнасьці збожжавых культур, самым непасрэдным чынам залежыць выкананьне народна - гаспадарчага пляну ў цэлым.

Трэба бачыць розьніцу паміж цяперашнім калгасным рухам і тым, што было ўсяго два-тры гады таму назад. Зараз ужо ня чуваць аб выхадзе з калгасаў. Наадварот, выключэньне з калгасу селянамі расцэньваецца, як нішчасьце. Выгады калгасу селяніну ўжо ясны. Але гэта далёка ня ўсё, што трэба. Трэба яшчэ дабіцца сьвядомых адносін калгасьнікаў да сваіх **абавязкаў** перад калгасам і дзяржавай, належнай дысцыпліны ў калгаснай працы, перапачатковага выкананьня ўсімі калгасьнікамі і калгасам у цэлым устаноўленых для іх дзяржаўных заданьняў. Трэба пры гэтым **дапамагчы** калгасам у арганізацыі грамадзкай працы ў калгасах і ў абароне іх інтарэсаў ад кулацка-шкодніцкіх элементаў. Веснавая сяўба будзе сур'ёзнай праверкай якасьці нашай работы з калгасамі, а таксама з саўгасамі.

Справа разгортваньня **таварабароту** паміж горадам і вёскай мае вялікае значэньне як для снабжэньня рабочых, так і для далейшага ўмацаваньня саюзу рабочай клясы з працоўнымі сялянствам. І ў гэтых адносінах у нас адбыліся за апошні перыяд буйнейшыя зьмены.

Тут ня трэба даказваць, што ў сучасных умовах, такіх розных ад першага этапу непу, савецкі гандаль павінен быць арганізован па-новаму — без капіталістаў, без спэкулянтаў, бяз прыватнікаў. Гэта задача вельмі складаная. Між тым, наш дзяржаўна-кааперацыйны гандлёвы апарат яшчэ вельмі непаваротлівы, вельмі бюракратычны. Тавараў вырокага ўкытку ў нас у гэтым годзе будзе больш, чым у мінулым, і мы можам пакрысе, але сыстэматычна паляпшаць снабжэньне прамтаварамі рабочых і сялян. Справа ўпрасціцца, перш за ўсё, у арганізацыю снабжэньня.

За мінулы год быў праведзен рад мерапрыемстваў па паляпшэньні работы дзяржаўнага і кааперацыйнага гандлю, па стварэньні адпаведных таварных баз, па ўзмацненьні рыначнага фонду і г. д. Асабліва значэньне мае рашэньне аб перадачы рабочых кааператываў у непасрэднае веданьне заводаакіраўніцтваў буйнейшых прадпрыемстваў. Ад уменьня арганізаваць гэту справу ва многім залежыць паляпшэньне снабжэньня рабочых і служачых, асабліва асноўных прамысловых раёнаў.

Стварэньне ўзорнай харчовай базы пры прадпрыемствах і пры кааператывах у нас прыметна пасунулася наперад. Трэба і гэту справу значна ўпрадкаваць, што павінна даць прыкметныя разультаты ўжо ў гэтым годзе.

З другога боку, па-новаму стаіць пытаньне аб арганізацыі спрэды дэцэнтралізаваных **загатовак** сельска-гаспадарчых прадуктаў. Тут, як і ў **калгасным гандлі**, у мінулым годзе мы ня здолелі забясьпечыць належнай арганізаванасьці. Наадварот, у радзе выпадкаў невдаровая канкуранцыя паміж асобнымі загатоўчымі арганізацыямі і спэкулянцкія замашкі некаторых нашых работнікаў, у тым ліку і камуністаў, нярэдка сур'ёзна адчуваліся. У некаторых выпадках цэны ў загатоўчых раёнах і на калгасных рынках ўздуваліся вельмі моцна, па радасьць усялякіх спэкулянтаў і спэкулянткаў. Зараз пастаўлена задача наладзіць работу канвэйцыйных бюро, дабіцца правільнага рэгуляваньня і ўстойлівасьці цэн як у раёнах дэцэнтралізаваных загатовак, так і адпаведна на рынках калгаснага гандлю, разгарнуць па-сапраўднаму барацьбу са спэкулянтамі, уздуваючымі цэны, і такім чынам увесьці **плянавасьць і арганізаванасьць у гэту галіну.** Нельга ня лічыцца з тым, што тут мы наткнуліся рад сур'ёзных труднасьцяй. Але, мочы ясную мэту, бальшавікі ўменоць перамагаць труднасьці. Нам трэба падцягнуцца ў гэтай справе значна, і тады труднасьці і тут мы пераможам.

Зараз аб нашых **фінансах.**

Наш дзяржаўны бюджэт расьце з кожным годам на мільярды. У гэтым годзе ён павялічваецца больш, чым на 4,5 млрд. руб. супроць мінулага году, прычым расходы павінны перавысіць расходы на 1,5 млрд. р. Аб такіх бюджэтах ні ў адной капіталістычнай краіне зараз і ня мараць. Там няма бездэфіцытных бюджэтаў. Бюджэты буржуазных дзяржаў адзначаюць іх эканамічнаму становішчу, г. зн. у іх ня зьведзены канцы з канцамі. Але гэта ўжо іх справа...

У нашым бюджэце сходзяцца ніці ад усяго гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, і таму разам з ростам бюджэту для нас асабліва важна забясьпячэньне найстрожэйшай бюджэтнай дысцыпліны і пазвязэньне прадугледжаных плянам эканоміі ў выдатках. Што справа тут ідзе аб сур'ёзных рэчах — ня цяжка пераканацца.

Калі мы ставім задачу забясьпечыць прырост прамысловай прадукцыі ў 1933 годзе на 16.5 проц., нельга забываць, што за гэтай сухомнай лічбай стаіць вялізарныя практычныя задачы і сур'ёзнейшыя матар'яльныя дзяржаўныя інтарэсы. Нельга забываць таго, што кожны процант прыросту прамысловай прадукцыі азначае прырост прадукцыі на 320-340 мільёнаў рублёў. А мы-ж жадаем і павінны выканаць заданьне па павялічэньні прадукцыі не па 1 проц., і не на 5 проц., і нават не на 10 проц., а ня менш, чым на 16 проц. Значыцца, і недавыкананьне тэй ці іншай часткі заданьня па прыросту прадукцыі зьяўляецца вялікім уронам для нашых фінансаў і для ўсёй гаспадаркі.

Калі мы гаворым аб тым, што ў 1933 годзе мы павінны павысіць прадукцыйнасьць працы ў прамысловасьці на 14 проц., дык трэба памятаць аб матэр'яльна-фінансавым значэньні гэтага заданьня. Для гэтага мы павінны ведаць, што кожны процант павышэньня прадукцыйнасьці працы ў прамысловасьці дае дзяржаве 290 млн. руб. Значыцца, змагаючыся за павышэньне прадукцыйнасьці працы шляхам паляпшэньня скарыстаньня ўсіх нашых матар'яльна-тэхнічных сродкаў і лепшай арганізацыі працы, мы выконваем работу вялізарнай важнасьці для нашай рабоча-сялянскай дзяржавы.

І вось яшчэ адзін прыклад.

Праз наш дзяржаўна-кааперацыйны гандлёвы апарат праходзіць вялізарная колькасьць тавараў. Без вялікіх арганізацыйных выдаткаў тут не абыдзецца. Аднак, ёсьць у гэтай справе няма такіх лішніх нікчемных выдаткаў, без якіх можна было-б абыйсьціся, ці прынамсі, скараціць, і з'эканомім тым самым у карысьць дзяржавы дзесяткі, а можа быць і сотні мільёнаў рублёў, якія могуць пайсьці на прадукцыйныя і культурна-бытавыя мэты.

Маштаб нашай гаспадарчай работы вялізарны. Тым больш увагі павінна быць адведзена паляпшэньню арганізацыі справы, правядзеньню рэжыму эканоміі, як гэтага патрабуюць пэўныя і рабочая клясы. Барацьба з бесгаспадарчасьцю, барацьба з залішнімі выдаткамі, не гаворачы ўжо аб бараньбе з расхрадаваньнямі, стаяла і павінна стаяць у ліку нашых важнейшых задач. І бюджэтная і крэдытная дысцыпліна павінны быць забясьпечаны поўнасьцю. Для гэтага мы стварылі цяпер значна больш спрыяючыя прадпасылкі як у самым гаспадарчым, так і ў банкаўскім апараце. Беражлівыя адносіны да савецкай капейкі на справе — лепшая прапасьлька ўкарэньненьня гаспадарчага разрахунку. Супроць зладзеяў і разгільдзяяў трэба змагацца з прыстасаваньнем самых рашучых мер.

Пралетарская дзяржава ўкладвала і будзе ўкладваць вялізарныя сродкі ў будаўніцтва новых заводаў, фабрык, электрастацый, чыгунак, а таксама сельска-гаспадарчых прадпрыемстваў. Мы ведаем, што для дзяржавы няма і ня можа быць нічога больш фонтабэльнага, чым нашы выдаткі на разьвіцьцё прамысловасьці і асабліва цяжкай індустрыі. Гэтым закладваюцца мацнейшыя асновы сацыялістычнага грамадзтва, якое створыць сапраўды чалавечыя культурныя і свабодныя ўмовы жыцьця. Ленін у свой час спэцыяльна падкрэсьліў неабходнасьць і палітычнае значэньне фінансавага падтрыманьня новага грамадзкага ладу, што пралетарыяту ня менш неабходна, чым буржуазіі, якая траціла і трэціць многія сотні мільёнаў і мільярды рублёў на ўмацаваньне капіталістычнага рэжыму. Але Ленін таксама ня раз гаварыў аб неабходнасьці найвялікшай эканоміі. У дзяржаўных выдатках і аб выгнаньні лішніх выдаткаў у дзяржапараце, каб забясьпечыць належнае матар'яльна-фінансавае падтрыманьне асноўным мерапрыемствам савецкай улады. Гэтым указаньнем Леніна мы павінны кіравацца і шкалей.

І так, плян першага году другой пяцігодкі патрабуе ад усіх нас вялізарнай работы па ўзьнаўленьні гаспадарчай работы на новую, больш высокую ступень. Гэта задача стаіць перад усім дзяржаўным апаратам на ўсіх галінах работы. У вырашэньні гэтай задачы павінны прымаць актыўны ўдзел як радавыя рабочыя і калгасьнікі, так і асабліва кіраўнікі гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Апрача ўсяго іншага, яким трэба для гэтага ўзьняць прапоўную дысцыпліну знізу да верху ў дзяржаўным і кааперацыйных прадпрыемствах, у калгасах і установах. І зрабіць гэта не па-бюракратычнаму. Мы ўсе памятаем, з якой рашучасьцю Ленін падкрэсьліваў практычныя лёзунгі гаспадарчай работы з самага першага пэрыяду Кастрычніцкай рэвалюцыі. Яшчэ ў 1918 г., вызначаючы чарговыя задачы савецкай улады, Ленін гаварыў:

> «Акуратна і добрасумленна лічы грошы, гаспадар эканомна, не лянуйся, ня крадзь, захоўвай самую строгую дысцыпліну ў працы—іменна такія лёзунгі, якія спрыяліва высмейваліся рэвалюцыйнымі пралетарамі тады, калі буржуазія прыкрывала падобнымі гутаркамі сваё панаваньне, як клясы эксплёататараў, стаўшаяна цяпер, пасьля зьвяржэньня буржуазіі, чарговымі і галоўнымі лёзунгамі моменту» (Ленін, 3-е выд., т. XXII, стар. 443).

А ў сваіх «Тэзісах аб чарговых задачах савецкай улады» Ленін асабліва выносіў пытаньне аб дысцыпліне:

> «Жалезная дысцыпліна і да канца праведзеная дыктатура пралетарыяту супроць дробнабуржуазных хісканьняў —такі агульны і вялікоры лёзунг моманту» (Ленін, 3-е выд., т. XXII, стар. 501).

Мы павінны ўмацаваць прапоўную дысцыпліну, апіраючыся ў правядзеньні сваіх мерапрыемстваў на падтрыманьне мас, на сьвядомасьць і актыўнасьць рабочых, калгасьнікаў і работнікаў дзяржапарату.

Ва ўмовах разгортваньня барацьбы за поўную ліквідацыю капіталістычных элементаў, маніпуляцыя разьлікі на зьмякчэньне клясавай барацьбы — простае глупства або палітычная бясхрыбетнасьць. Наша задача, шадваро, заключаецца ва ўмацаваньні магутнасьці пралетарскай дыктатуры і правядзеньні бязьлітасных мер супроць рэшткаў клясавага ворага, які супраціўляецца, і супроць буржуазных перарожэнцаў.

Сілы рэшткаў варожых клясаў, якія ня ліквідуюцца, растуць; адкуль, іх яшчэ падмацоўваюць ня толькі вэрагоўна, але і матар'яльна непрыхаваныя вароглыя да краіны, якая будуе сацыялізм, замежныя буржуазныя колы. Сярод пануючых заграніцай буржуазных кругаў і груп ёсьць яшчэ ня мала такіх, якія для падтрыманьня свайго ўладаньня карыстаюцца кажнымі ня толькі ў сябе на бацькаўшчыне, але і маюць у СССР сваіх агентаў, што слухаюць ім разьведкай і зброяю у барацьбе з савецкай уладай. Тым з большай настойлівасьцю мы будзем умацоўваць магутнасьць пралетарскай дыктатуры ў СССР. І мы будзем гатэрыцца, калі ніці ўжо будзе трэба пакласьці у цэль, калі ён будзе моцным ударам ня толькі па нашым унутраным клясавым ворагу, але і па клясавым ворагу за межамі Савецкага саюзу.

Іншага шляху няма для ліквідацыі капіталістычных элементаў і капіталізму і перамогі сацыялізму.

III.

МІЖНАРОДНАЕ СТАНОВІШЧА І НАШЫ ЗАДАЧЫ

У галіне **міжнародных адносін** трэба разглядаць пазыцыі СССР у сьвятле вынікаў першай пяцігодкі.

Ня можа быць ніякага сумненьня ў тым, што спачуваньне да СССР у працоўных масах усіх краін за гады пяцігодкі значна ўзрасло. У гэтым нельга ня бачыць сур'ёзнага **ўмацаваньня** міжнародных пазыцый Савецкага саюзу.

З другога боку, факты з галіны іншых узаемаадносін з урадамі замежных дзяржаў таксама сьведчаць аб гэтым. Даволі ўказаць на заключэньне раду пактаў аб ненападзе на працягу мінулага году.

Нашы адносіны з іншымі дзяржавамі, як правіла, разьвіваліся зусім нармальна, ня гледзячы на зьмены, якія адбываліся ва ўрадах асобных краін. Наколькі нашы адносіны з замежнымі дзяржавамі акрасьліваюцца, перш за ўсё, нашым унутраным ростам, ростам сіл савецкай улады, гэтыя адносіны ўмацоўваліся ў сілу самой лёгікі рэчаў.

Асаблівае месца ў гэтых узаемаадносінах належыць Германіі. З усіх краін, якія маюць з намі дыпляматычныя адносіны, з Германіяй мы мелі і маем найбольш моцныя гаспадарчыя сувязі. І гэта невыпадкова. Гэта вынікае з інтарэсаў абедзьвюх краін. Вы ведаеце таксама пра тое, што прыезд у СССР старшыні рады міністраў Турэцкай рэспублікі Ісмэт Пашы і яго бліжэйшага супрацоўніка міністра замежных спраў Рушдзі Бэя спрыялі далейшаму ўмацаваньню супрацоўніцтва абедзьвюх краін. А гэта вынікае як з міжнароднай абстаноўкі і інтарэсаў усеагульнага міру, так і з неабходнасьці далейшага пашырэньня гэтага супрацоўніцтва. Як вядома, прысутнасьць кіраўніка палітыкі Турэцкай рэспублікі ў Маскве спрыяла заключэньню раду важных практычных згод па лініі матар'яльна-фінансавай і культурнай.

За апошні год трэба адзначыць некаторыя **новыя моманты** ў разьвіцьці замежных адносін СССР. Сюды адносіцца адваўлёнае дыпляматычных зносін паміж СССР і Кітаем. Як вядома, у свой час ініцыятыва разрыву гэтых адносін была з боку панкінскага ўраду. Мне застаецца адзначыць, што і ініцыятыва адналёньня гэтых адносін была таксама з боку гэтага ўраду, што, у сваю чаргу, спаткала поўнае наша падтрыманьне. Мы думаем, што гэтым выпраўлена памылка, якая была дапушчана ў адносінах да СССР, і ня нам перашкаджаць яе выпраўленьню.

Пытаньне аб устанаўленьні дыпляматычных адносін з СССР, цяпер кажуць, абмяркоўваецца і ў некаторых іншых краінах. Да нас даходзяць такія весткі, што пры гэтым знаходзяцца мудрацы, якія ўсё яшчэ лічаць неабходным нейкае асобнае «вывучэньне» СССР. Вось, напрыклад, ужо ня першы год тлыбокадумна «вывучаюць» СССР некаторыя міністры Чэха-Славакіі. Карысьці ад гэтага, між іншым, ніякай ня відаць. Да таго-ж гэта проста стара, пастарэла прынамсі на 10 год, а то і болей. Савецкая ўлада існуе вось ужо 15 год. І вось ужо 10 год мінула з часу стварэньня СССР, і значэньне гэтага факту сёньня было даволі падкрэслена **т. Калініным.** І ня глядзячы на гэта, па сьлядох Чэха-Славакіі ідуць нават міністры такіх дзяржаў, як ПАЗІН. Між тым, чыс было-б зразумець, што ўзьнік сабою СССР, асабліва пасьля выкананьня першай пяцігодкі. І, здаецца, ня цяжка здагадацца, наколькі ўсьнялася магутнасьць Савецкага саюзу, наколькі вялікі яго рост, наколькі вырасла міжнароднае значэньне СССР. Да таго-ж на адсутнасьці дыпляматычных зносін традыцыі і трацяць у першую чаргу тыя, якія займаюцца пустымі, нікому не патрэбнымі гаворкамі аб асобным «вывучэньні» СССР, пры адсутнасьці дыпляматычных зносін з Савецкім саюзам.

З другога боку, нельга не адзначыць факту дэнансаваньня гандлёвага дагавору, заключанага ў 1930 г. паміж СССР і Англіяй. Дэнансаваньне гэтага дагавору адбылося на ініцыятыве ангельскага ўраду. І нам яшчэ невядома сапраўдная мэта гэтага акту, застаецца аб гэтым здагадвацца. Калі разрывам гандлёвай згоды хтосьці хацеў папалохаць Савецкі саюз, то гэта проста нясур'ёзна, бо мы не баімся і не баімся такіх рэчаў. Калі-ж гэтым разрывам хацелі пашкодзіць нашай краіне які-небудзь уроп, то і гэта жалкі разлік. Мусіць, у Англіі гэта добра зразумеюць тыя, хто цяпер мае такую вострую патрэбу ў савецкіх заказах. Мы-ж ведаем цьвёрда адно: краны, якія падтрымлівалі нармальныя дыпляматычныя і гандлёвыя зносіны з СССР, бязумоўна выпрывалі ў параўнаньні з іншымі дзяржавамі. Тым больш, што Савецкі саюз, у адрозьненьне ад некаторых капіталістычных дзяржаў, вяўсёды дакладна і сваячасова выконваў усе свае абавязацельствы. І хоць цяпер гэта становішча ў міжнародных адносінах усё больш рэдкім зьявішчам, СССР і ў гэтых адносінах, як заўсёды, верны сабе.

Але мы, зразумела, прымаем да ведама заяву ангельскага ўраду аб тым, што ён застаецца зацікаўленым у разьвіцьці гандлю паміж абедзьвюма краінамі.

Усё сказанае вышэй трэба зьвязаць з асноўнымі пытаньнямі міжнароднай палітыкі і, перш за ўсё, з асноўнай задачай замежнай палітыкі СССР—палітыкі пасьлядоўнай **барацьбы за ўсеагульны мір** і за мірныя адносіны СССР з іншымі краінамі.

Да ўсіх пытаньняў, якія маюць адносіны да гэтай справы, да справы забясьпячэньня ўсеагульнага міру і, у прыватнасьці, мірных адносін Саюзу ССР з іншымі дзяржавамі, як і да ўсіх пытаньняў, якія маюць адносіны да небясьпекі новых войнаў, мы адносіліся і адносімся з асаблівай увагай і з асаблівай чуласьцю. З гэтага выцякае, між іншым, наша пазыцыя ў пытаньні аб разабраньні.

На міжнароднай камісіі па разабраньні тав. **Літвінавым** быў поўнасьцю разьвіт пункт гледжаньня савецкага ўраду на справу ўсеагульнага разабраньня. Зараз няма неабходнасьці зноў угрунтоўваць нашу пазыцыю ў гэтым пытаньні. Мне застаецца толькі нагадаць аб рэзалюцыі, унесенай савецкай дэлегацыяй у генэральную камісію па разабраньні ў лютым мінулага году. Вось рэзалюцыя, якую савецкая дэлегацыя прапанавала прыняць камісіі па разабраньні ў Жэнэве. У рэзалюцыі сказана:

> «Натхнёная цьвёрдым імкненьнем да сапраўднага, моцна арганізаванага міру; кіруемая жаданьнем стварыць рэальную бясьпечнасьць для ўсіх дзяржаў і народаў шляхам папярэджаньня новых войнаў, пераконаная, што само існаваньне ўзбраеньняў і іх яўна выражанае імкненьне да бесперапыннага росту ня можа ўзняць да міжнародных узброеных канфліктаў, якія ахрыва

Працяг дакладу тав. Молатава

лай эпыклёпэды да сьпісу так званых «незалежных» дзяржаў памылкова адносяць народка і такія дзяржавы, якія на справе не зьяўляюцца незалежнымі, скажам, у сваёй замежнай палітыцы, а падначалены ў сапраўднасьці замежнай палітыцы іншых дзяржаў, больш моцных і таму дыктуючых сваю волю некаторым «незалежным» урадам. Ва ўсякім выпадку, ад гэтага прайграе толькі Румынія і яе ўрад.

Наранце, адносна пытаньняў, зьвязаных з **Далёкім Усходам.**

Вы ведаеце, якая мітусьня ідзе вакол далёка ўсходніх спраў у Лізе нацый. Вось ужо больш году, як Ліга нацый зьвярэцца прынцыпіяльна-небудзь раньпьне аб падзеях у Манчжурыі, аб падзеях на Далёкім Усходзе. Вось ужо многа раз Ліга нацый вызначала тэрміны для вынесьня сваіх пастаноў па гэтых пытаньнях. Ліга нацый абмяркоўвала становішча ў Кітаі і Манчжурыі многа раз і пасылала для вывучэньня спраў на месны спэцыяльную камісію. Прайшло ўжо даволі часу, як вярнулася гэта камісія і як апублікован яе даклад.

Ліга нацый стварае камісію за камісіяй па гэтых справах і ўсё ж ніяк раньпьняў прынцыпіяльна так і ня можа. Справа ня рушыцца з мёртвага пункту. Толькі адна справа прасунулася наперад — гэта справа далейшай дыскрэдытацыі Лігі нацый у вачох усяго сьвету.

Але вы добра ведаеце, што мы ніколі ня зьвязвалі сваіх надзей з Лігай нацый і з яе камісіямі. Між тым пытаньні міжнародных адносін на Далёкім Усходзе датычаць нас вельмі блізка. Мы павінны, у сувязі з гэтым, прадугледжваць рад мер.

Улічваючы абстаноўку, якая склалася на Далёкім Усходзе, Савецкі ўрад болей году таму назад зрабіў Японіі прапанову аб заключэньні пакту аб ненападзе. Польша на балцыйскім усяго палітычнага значэньня гэтай прапановы ў данай мяжы народнай абстаноўцы. Адначас падаўна японскі ўрад паведаміў нас аб сваім адмаўленьні за ключыць пакт аб ненападзе ў дадны момант.

Я ня буду ўваходзіць у ацэнку матываў адхіленьня японскім урадам нашай прапановы аб пакце аб ненападзе. Мы разьлічваем аднак, ня тое, што гэта адмаўленьне часовае, але ня лічыцца з фактам мы, зразумела, ня можам.

Савецкі ўрад пасьлядоўна праводзіць і на Далёкім Усходзе палітыку няўмешваньня і строгага нэйтралітэту, у адносінах іншых краін. Мы і цяпер цьвёрда стаімо на гэтай пазыцыі і будзем таксама пасьлядоўна праводзіць яе і раней, як і раней, у інтарэсах міру. Аднак, асобныя факты з галіны адносін некаторых японскіх колаў да СССР зварачаюць на сябе за апошні час асаблівую ўвагу. Справа дайшла да апублікаваньня японскім вайсковым міністэрствам правакацыйнага паведамленьня аб савецкім урадзе і будучым наўпрадзтве СССР у Кітаі. І, ня гледзячы на катэгарычныя абвяржэньні з нашага боку гэтых антысавецкіх выдумак, міністар замежных спраў у Японіі пан Учыда паўтарыў іх у японскім парляманце 21 студзеня. Займаюць абвяржэньнем гэтых антысавецкіх выдумак я ня лічу патрэбным, — яны і без таго самі сябе пабіваюць.

Што ж датычыць аднаўленьня дыпломатычных адносін СССР з Кітаем, то Савецкі саюз выражае такія пытаньні незалежна ад таго, прыемна гэта каму-небудзь ці, наадварот, няпрыемна, ССР выходзіць у такіх выпадках з інтарэсаў усеагульнага міру, з асноў сваёй мірнай палітыкі.

Пан Учыда заявіў у парляманце аб тым, што з самага пачатку ўмяшківаньня манчжурскага інцыдэнту не адбылося нічога няпрыемнага ва ўзаемаадносінах Савецкага саюзу з Японіяй, бо савецкі ўрад займаў «асьцярожную пазыцыю».

Лічу неабходным адзначыць, што справа ня толькі ў тым, што палітыка Савецкага саюзу асьцярожная. Гэта палітыка ня толькі асьцярожная, але і прадуманая, прычым савецкі ўрад выходзіць і тут, перш за ўсё, з інтарэсаў справы ўсеагульнага міру і з інтарэсаў умацаваньня мірных адносін з іншымі краінамі.

Гэту палітыку, палітыку міру і надалей урад СССР будзе пасьлядоўна і няўхільна праводзіць у сваіх узаемаадносінах з іншымі дзяржавамі, як-бы яе не расцэньвалі тыя ці іншыя ўрады.

Міжнародная абстаноўка зноў нам напамінае аб неабходнасьці ўзмоцненай пільнасьці і, ў прыватнасьці, асаблівай увагі да становішча на Далёкім Усходзе. Гэта павінна знайсьці сваё адлюстраваньне ва ўсёй нашай рабоце і ва ўсім нашым будаўніцтве, якое зьвяляецца асновай росту нашай эканамічнай і палітычнай магутнасьці.

У 1933 г. мы павінны зрабіць новы гіганцкі крок у справе пабудовы сацыялізму ў нашай краіне. Перш за ўсё, ад посьпехаў нашай гаспадарчай работы будзе залежаць умацаваньне нашых унутраных і міжнародных пазыцый. Барацьба за **поўнае** выкананьне пляну бягучага году павінна стаяць у цэнтры ўвагі партыі, рабочай клясы і працоўных мас вёскі. Мы павінны згуртаваць вакол партыі, саветаў і прафсаюзаў найшырэйшыя масы працоўных для выкананьня пастаўленых плянам задач. Сілы нашы мацнеюць з кожным днём. Справа рабочай клясы СССР знаходзіцца ў верных руках і таму яна перамо**жа. (Бурныя аплёдысмэнты, усе ўстаюць).**

III-я сэсія ЦВК СССР 6-га скліканьня

Вячэрняе пасяджэньне 25 студзеня

На ўчарайшным вячэрнім пасяджэньні, якое адбывалася пад старшынствам тав. **Мусабэкава,** выступіў тав. **Прадчанка** (Паўночны край), які спыніўся на пытаньнях умацаваньня міжнароднага становішча Савецкага Саюзу.

Аб буйнейшых дасягненьнях Беларускай рэспублікі паведаміў дэлегатам сэсіі тав. **Галадзед.**

З вялізарнай увагай была заслухана прамова арцемаўскага старшыні сельсавету Маскоўскай вобласьці тав. **Ульянавай.**

На вячэрнім пасяджэньні выступалі таксама т. т. **Андронікаў** (Урал), **Кліменка** (Украіна), **Межлаук** (Дзяржплян), **Рыкаў** і **Сакольнікаў.**

* * *

Вячэрняе пасяджэньне Савету Нацыянальнасьцяй пад старшынствам тав. **Г. І. Пятроўскага** было прысьвечана працягу спрэчак па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава.

З цікавою прамовою выступіў прадстаўнік Азэрбайджанскай АССР тав. **Эфэндзіеў.** Ён адзначыў выключную ролю т. т. **Леніна, Сталіна, Арджанікідзэ, Кірава, Мікаяна** ў стварэньні Закаўказкай Сацыялістычнай Федэрацыйнай рэспублікі.

Аб вялізарных посьпехах Татарыі гаварыў тав. **Ягудзін.** Тав. **Санглібаеў** сваю прамову прысьвяціў сацыялістычнаму будаўніцтву Чаркескай Аўтаномнай вобласьці, тав. **Марозаў** — Чувашыі.

Тры выступленьні — т. т. **Хаджыбаева, Гарбунова і Бакіева** былі прысьвечаны Савецкаму Таджыкістану.

Выступленьнем тав. Бакіева скончыліся спрэчкі па дакладах т. т. Молатава і Куйбышава ў Савеце Нацыянальнасьцяй

Ранішняе пасяджэньне 26 студзеня

МАСКВА, 26. **На ранішнім пасяджэньні сэсіі ЦВК 26 студзеня** працягваліся спрэчкі па дакладах Молатава і Куйбышава.

У Саюзным Савеце выступалі **Цреліна** (Паўночны Каўказ), **Яўрэінаў** (УсеЦСПС), **Курц** (Інтурыст), **Пракоф'еў** (ВМБІТ), **Маёрава** (РСФСР), **Вайцэхоўскі** (УССР), **Прыжэлоўскі** (РСФСР), **Макараў** (Сярэдняя Волга).

Пасьля скончэньня спрэчак адкрываецца абъединаенае пасяджэньне Саюзнага савету і Савету нацыянальнасьцяй пад старшынствам тав. **Чарвякова.** З заключным словам выступае тав. **В. М. Молатаў,** сустрэчаны бурнымі аплёдысмэнтамі.

Пасьля прамовы тав. Молатава слова для прапановы прадастаўляецца т. **Мусабэкаву.**

— Даклады т. т. Молатава і Куйбышава і разгорнутыя спрэчкі, — гаворыць Мусабэкаў, — сьведчаць аб вялізарных дасягненьнях сацыялістычнага будаўніцтва. Спрэчкі паказалі, што прапанаваны ўрадам і дзяржкіраўнай плянавай камісіяй СССР народна-гаспадарчы плян на 1933 год сустрэў поўнае ўхваленьне членаў ЦВК СССР.

Плян вялікай будоўлі першага году другой пяцігодкі пры мабілізацыі творчых сіл самых шырокіх мас рабочых і сялян пад выпрабаваным кіраўніцтвам ленінскага ЦК партыі, пад выпрабаваным кіраўніцтвам правадыра тав. Сталіна—будзе з посьпехам выкананы.

Тав. Мусабэкаў уносіць прапанову аб ухваленьні замежнай і ўнутраной палітыкі ўраду СССР і аб зацьвярджэньні прапанаванага Саўнаркомам і Дзяржплянам СССР народна-гаспадарчага пляну.

Саюзны савет і Савет Нацыянальнасьцяй разьдзельным галасаваньнем **аднагалосна** прымаюць прапанаваную Мусабэкавым пастанову.

УЗНАГАРОДА т.т. ВЫШЫНСКАГА і КРЫЛЕНКІ

МАСКВА, 26. Улічваючы вялікія заслугі **тав. Вышынскага А. Я.** у справе ўмацаваньня органаў юстыцыі, а таксама яго выдатную работу па выкрыцьці шкодніцкіх і контр-рэвалюцыйных арганізацый, прэзыдыум ЦВК РСФСР пастанавіў **узнагародзіць тав. Вышынскага ордэнам Працоўнага Чырвонага сьцягу РСФСР.**

Прэзыдыум ЦВК СССР за выдатныя заслугі па ўмацаваньні органаў савецкай юстыцыі і за работу па выкрыцьці шкодніцкіх і інш. контр-рэвалюцыйных арганізацый пастанавіў **узнагародзіць тав. Крыленку ордэнам Леніна.**

Кірмаш за палярным кругам

Ненцы чытаюць даклад тав. Сталіна

НАР'ЯН-МАРА. Скончыўся першы ненецкі кірмаш у Нар'ян-Мары. Звыш 20 калгасаў крайняй Поўначы прынялі ўдзел у першым калгасным тандзі за палярным кругам.

З грузам совікаў, маліц, пімаў, пушнины прыплылі аленні санёй з чумаў качавых ненецкіх калгасаў Мала-Зямельскай тундры. Больш за ўсіх — на 25 тыс. руб. — футровай продукцыі прывёз з Большазямельскай тундры аленегадоўчы калгас «Харп». Мяса і масла вінулі на кірмаш калгаснікі Усьць-Цыльмы. З сёмгай і селядцамі прыехалі рыбакі Ніжня-Печорскага раёну.

Кірмаш працягваўся чатыры дні. Яго зваарот перавысіў 350 тыс. руб.

Раз'язджаючыся па чумах, ненцы калгасаў заявілі, што на другі кірмаш іх парты прывезуць у два разы больш тавараў.

* * *

Першая рэвалюцыя на ненецкай мове напісана 20 студзеня. У гэты дзень у Нар'ян-Мары адбыўся сход ненецкага актыву тундры, у якім прымала ўдзел больш 30 калгаснікаў аленяводаў.

Калгасны актыў зацьвярджае поўнасьцю абмеркаваў даклад тав. Сталіна на пленуме ЦК і ЦКК. Яго пастановчыя прапрацаваць у кожным ненецкім калгасе.

АБ СТАНОВІШЧЫ ХОДУ РАМОНТУ І ПАДРЫХТОЎКІ МАШЫНА-ТРАКТАРНАГА ПАРКУ БССР ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б

1. ЦК адзначае, што работа па рамонту трактарнага парку і прыцапнога інвэнтару, як па лініі Трактарацэнтру, так і саўгасаў усіх сыстэм, стаіць пад яўнай пагрозай зрыву. Па становішчы на 15-І г. г. адрамантавана толькі 300 трактараў з агульнай колькасьці падлягаючых рамонту 2.753 шт., у тым ліку: адрамантавана па МТС — 186 штук, у саўгасах — 87 шт.

2. Лічыць устаноўленым, што з боку Трактарацэнтраў, дырэктароў МТС, саўгасаў, трэстаў і Белкаапсаюзу не праведзена праверка трактараў і не ўстаноўлена, у якой ступені патрабуецца рамонт кожнага трактару, а таксама і запчастак да іх.

3. З боку кіраўнікоў Трактарацэнтраў: т. т. Грабенчыка, Качука, Дубоўскага і іх адказных выканаўцаў па тэхнічнай частцы т. т. Бакуньманава, Кушаля і Прудзікава праявілена яўная бязьдзейнасьць у своечасовай падрыхтоўцы і разгорваньні рамонту трактарнага парку і с.-г. машын. Не забясьпечан падбор і камплектаваньне кваліфікаванай рабочай сілай і адміністрацыйна-тэхнічным персаналам, а таксама з іх боку і з боку адпаведных райкомаў КП(б)Б і РВК ня прыняты належныя меры да паляпшэньня матар'яльна - бытавога абслугоўваньня рабочых і тэхнічнага персаналу майстэрань капітальнага рамонту. Адсутнічае зусім работа па мабілізацыі ўнутраных ресурсаў (мэталялом), якія могуць быць скарыстаны для рамонту і вырабу частак.

4. З боку Наркамзему, упаўнаважанага Наркамсаўгасаў і Белкаапсаюзу ня прыняты своечасовыя апэрацыйныя меры, не ўстаноўлен штодзённы кантроль і праверка за ходам рамонту трактараў і с.-г. машын.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Для забесьпячэньня выкананьня ў тэрмін пастановы пленуму ЦК аб заканчэньні рамонту трактарнага парку і с.-г. машын 15 сакавіка, ЦК звяртае выключную ўвагу на якасьць рамонту трактараў і с.-г. машын.

Устанавіць, што за якасьць рамонту нясуць адказнасьць дырэктар МТС, дырэктар саўгасу і заг. майстэрні капітальнага рамонту.

Устанавіць, як правіла, што трактар лічыцца адрамантаваным тады, калі падпісан акт здачы і прыёмкі заг. майстэрні, а ў заводах — заг. цэху, старшым трактарыстам МТС, саўгасу, які прымае трактар і трактарыстам, які замацован для работы на гэтым трактары.

НКЗему, Трактарацэнтрам і ўпаўнаважанаму Наркамсаўгасаў устанавіць у адпаведнасьці з гэтым улік рамонту трактараў кожныя пяць дзён.

2. Ускласьці персанальную адказнасьць за своечасовы, поўны і даброякасны рамонт трактарнага парку і прыцапнога інвэнтару па НКЗему на тав. Еўдакімава, па Ільнатрактарацэнтру — на тав. Качука і Кушаля, па Бульбатрактарацэнтру — на тав. Грабенчыка і Бакуньманава, па Збожжатрактарацэнтру — на т. т. Дубоўскага і Прудзікава, па кіраўніцтву ўпаўнаважанага Наркамсаўгасаў — на т. Бімбата, па Белкаапсаюзе — на т. Шлейфэра.

3. Абавязаць персанальна ўпаўнаважанага Белканторы Снабрамонту тав. Бугніка забясьпечыць бесперабойнае снабжэньне запаснымі часткамі і рамонтнымі матар'яламі рамонтную кампанію трактараў.

4. Абавязаць Трактарацэнтр — т. т. Качука, Грабенчыка, Дубоўскага, Наркамзем — т. Рачыцкага, упаўнаважанага Наркамсаўгасаў — т. Сьмірнова ў дэкадны тэрмін правесьці праверку становішча ўсяго трактарнага парку, МТС і саўгасаў, ступень патрэбнасьці рамонту, запчастак і рамонтных матар'ялаў, скарыстаўшы для гэтай мэты спэцыялістаў цэнтральнага апарату, павучальных устаноў і найбольш вопытных мэханікаў самых МТС.

5. Абавязаць т. Рачыцкага ўзяць пад непасрэдны кантроль рамонт трактарнага парку па сыстэме Наркамзему, а т. Сьмірнова па сыстэме саўгасаў Наркамсаўгасаў, прыняўшы да ведама заявы т. т. Рачыцкага і ўпаўнаркамсаўгасаў аб тым, што імі ўстаноўлен каляндарны плян рамонту трактараў для кожнай майстэрні і заводу і ўведзена персанальная адказнасьць па лініі ўсіх трэстаў, МТС і майстэрань.

6. Абавязаць персанальна тав. Амбражунаса і Левіна (БМА) неадкладна прыступіць да вырабу запчастак як да трактараў, так і с.-г. машын, якія ім прыняты, як: 10.700 шатунных балтоў з гайкамі, 10.000 штук поршневых калец, 1.400 штук бронзавых утулак шатуна, 400 пар бронзавых укладаў шатуна, 100 шт. дыскаў муфты пачапленьня, 400 шт. бронзавых утулак цапф, 500 шт. камплектных поршняў, а таксама вырабу запчастак да асноўных с.-г. машын і адрамантаваць 294 трактары да ўстаноўленага тэрміну.

Абавязаць т. Амбражунаса, Левіна і Рачыцкага ў двухдзённы тэрмін даць канкрэтныя заданьні заводам па вырабу запчастак і рамонту трактараў і ўстанавіць падокладны каляндарны плян здачы запчастак і адрамантаваных трактараў адпаведным МТС і саўгасам.

7. Даручыць СНК у савецкім парадку ўзьняць хадайніцтва перад тав. Якаўлевым і Арджанікідзэ аб водпуску неабходнай колькасьці мэталу для рамонту трактараў, с.-г. машын і транспарту.

8. Абавязаць дырэктароў МТС, заг. майстэрань, дырэктароў саўгасаў і старшынь калгасаў прыняць рашучыя захады па мабілізацыі ўнутраных ресурсаў для рамонту трактараў і с.-г. машын, адначасова даручыць Белканторы Мэталягром, наладзіць мэталь, годны для вырабу запчастак і на рамонт машын, перадаваць заводам, выробляючым запчасткі і рамонтным майстэрням.

9. Улічваючы неабходнасьць тэхнічнага абсталяваньня рамонтных майстэрань даручыць тав. Іванову, Рачыцкаму і Амбражунасу вырашыць у 2-дзённы тэрмін пытаньне аб перадачы з прамысловасьці некаторай колькасьці токарных і балтарэзных варштатаў, а таксама снабжэньні неабходнай колькасьці інструментаў.

10. Прапанаваць Наркамшляху тав. Радзівонаву разам з упаўнаважаным Наркамцяжпраму тав. Амбражунасам у 5-дзённы тэрмін накіраваць для пастаяннай работы ў майстэрні капітальнага рамонту майстраў-мэханікаў — 13 чал., кваліфікаваных токараў па мэталю — 15 чалавек, кваліфікаваных сьлесароў — 27 чалавек.

11. Даручыць тав. Кузьмінку ў 3-дзённы тэрмін перагледзець склад загадчыкаў майстэрань і правесьці замену не забясьпечваючых работу майстэрань.

12. Даручыць Наркамснабу тав. Каменштэйну ўключыць у цэнтралізаванае снабжэньне прадуктамі харчаваньня пастаянных кваліфікаваных рабочых і тэхнічнага персаналу трактарных майстэрань капітальнага рамонту.

13. Прапанаваць сакратаром Аршанскага, Горацкага, Дзяржынскага, Лепельскага, Клімавіцкага, Гарадоцкага, Слуцкага, Гомельскага, Менскага, Рагачоўскага, Клічаўскага, Чэрыкаўскага, Любаньскага, Ветрынскага, Асьвейскага, Дрысьненскага, Полацкага, Уваравіцкага, Хойніцкага РК КП(б)Б устанавіць сыстэматычны кантроль за работай трактарных майстэрань капітальнага рамонту і прыняць захады да паляпшэньня матар'яльна-бытавых і культурных умоў рабочых гэтых майстэрань, замацаваўшы на час рамонту да майстэрань членаў бюро РК КП(б)Б.

14. Даручыць гаркомам праверыць выкананьне пастановы ЦК КП(б)Б адносна прынятых імі мерапрыемстваў аб пасылцы спэцыяльна брыгад пэфэтвуючых прадпрыемстваў для рамонту сельска-гаспадарчых машын.

15. У сувязі з устанаўленьнем дадатковых канкрэтных заданьняў па рамонту трактараў для раду прадпрыемстваў, якія раней не праводзілі гэтага рамонту, а таксама малочы на ўвазе наўмыснасьць выкладкаў няправільнай разьбіўкі і прымацаваньня раёнаў да адпаведных МТМ, даручыць тав. Іванову распрацаваць і ўнесьці на бюро ЦК КП(б)Б канкрэтныя прапановы аб больш дакладным і лепшым абслугоўваньні ў сэнсе рамонту трактараў.

Лічыць неабходным да справы рамонту трактараў прыцягнуць таксама і майстэрні Саюзтрансу па аўтарамонту.

16. Даручыць тав. Іванову распрацаваць дадатковыя мерапрыемствы па захаваньні трактарнага парку і сельска-гаспадарчых машын з выключэньнем таварыпоў, непасрэдна адказваючых за гэту справу.

17. Даручыць т. Лычову зацьвярдзіць праз сваю сельска-гаспадарчую групу дачу Цэнтральнаму Камітэту сыстэматычных справаздач і зводак аб ходзе рамонту.

18. За зусім недазвальняючае і неканкрэтнае апэрацыйнае кіраўніцтва ходам рамонту трактараў і прыцапнога інвэнтару — дырэктару Менскага Сьвінаводтрэсту тав. Жукаву і дырэктару Насенаводтрэсту тав. Андрэенку абвясьціць вымову.

Папярэдзіць дырэктароў Трактарацэнтраў: т. т. Качука, Дубоўскага, Грабенчыка і дырэктароў Аршанскага Сьвінаводтрэсту тав. Аскерка і Віцебскага Малочнапрамысловага трэсту тав. Казака, што калі з іх боку ня будзе ў бліжэйшыя дні дасягнут рашучы пералом у рамонце трактараў і прыцапнога інвэнтару, — будуць прыняты больш рашучыя меры спагнаньня.

19. Абавязаць цэнтральны друк разгарнуць сыстэматычнае асьвятленьне на старонках газэт ходу рамонту і падрыхтоўкі машына-трактарнага парку для веснавой пасеўкампаніі, устанавіўшы друкаваньне 5-цідзённых зводак.

Замест Лігі нацый—канцэрн 4-х вялікіх дзяржаў

ЖЭНЭВА. **«Журналь дэ Жэнэв»** выступае з сэнсацыйным выкрыцьцём таго, што ёсьць быццам новы плян Саймона. Гэты плян, па словах газэты, зводзіцца да таго, што Англія, надзвычай незадаволеная пастаянным умяшаньнем прадстаўнікоў малых дзяржаў у справы, якія іх не датычаць, у прыватнасьці японска-кітайскае пытаньне, **мае намер дабіцца фактычнага зьняцьця з ведама Лігі нацый важнейшых бягучых пытаньняў з тым, каб перадаць іх на вырашэньне канцэрну 4-х вялікіх дзяржаў — Англіі, Францыі, Італіі і Германіі.**

Водгукі польскай буржуазнай прэсы

ВАРШАВА, 26. Афіцыёз **«Газэта польска»** пад сэнсацыйным загалоўкам «Падзел Эўропы чатырма дзяржавамі» зьмяшчае тэлеграму карэспандэнта агэнцтва «Іскры» з Жэнэвы, якая падае зьмест артыкулу «Журналь дэ Жэнэв» аб пляне стварэньня блёку **у складзе Англіі, Францыі, Італіі і Германіі па разьмеркаваньні паміж імі сфэр уплыву ў Эўропе.** Адзначыўшы, што артыкул «Журналь дэ Жэнэв» зьяўляецца асноўнай тэмай для гутарак у кулуарах Лігі нацый, агэнцтва «Іскра» заяўляе:

«Заканчэньная дзейнасьць, крыніца якой знаходзіцца ў Лёндане і, накіроўваючыся праз Жэнэву, вядзе да трох сталіц, служыць прадметам пільнага нагляду ня толькі польскіх афіцыяльных колаў, але і польскай грамадзкай думкі».

«Газэта польска» камэнтуе гэту тэлеграму агэнцтва «Іскра» ў асобным артыкуле, у якім гаворыцца, што чуткі аб **«пляне падзелу Эўропы чатырма дзяржавамі»** заслугоўваюць пільнай увагі, паколькі іх паляраздвала нарада «вялікай чацьвёрці дзяржаў», рэзультаты якой яны хацелі зрабіць абавязковымі для канфэрэнцыі па разбраеньні.

«Толькі адноўная пазыцыя Польшчы, Юга-Славіі, СССР і інш. краін, — піша газэта, — не дазволіла ператварыць пасяджэньне дэлегатаў канфэрэнцыі ў збор паслухмяных гледачоў, якія сабраліся толькі для таго, каб даведацца, што загадваюць старшыня». Да вэрсіі «Журналь дэ Жэнэв», па думцы «Газэты польскай», трэба аднесьці скэптычна. «Акрамя чатырох дзяржаў, — піша «Газэта польска», — існуюць яшчэ Амэрыка і Японія, існуе таксама Савецкая Расія, якая не зьяўляецца ўжо краінай хаосу, як гэта было ў 1919 годзе. Вялікая дзяржава таксама і Польшча, якая зьяўляецца адной з краін, найбольш зацікаўленых ва ўсіх эўрапэйскіх справах, а разам з тым дзяржаваю яшчэ досыць магутнаю, з воляю якой неабходна лічыцца. Існуе рад іншых краін, якія не зьяўляюцца больш «прасіцелямі», як у 1919 годзе. Нарэшце, сумніцельна, ці адпавядае стварэньне вялікай чацьвёркі інтарэсам усіх дзяржаў, запрошаных да ўдзелу ў ажыцьцяўленьні гэтага пляну».

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

МАГУТНЫ РЭВАЛЮЦЫІНЫ АДКАЗ ПРАЛЕТАРАЎ БЭРЛІНУ НА ПРАВАКАЦЫЮ ФАШЫСТАЎ

100 тысячная дэманстрацыя ў Бэрліне

БЭРЛІН, 26. **Дэманстрацыя рабочых і працоўных на пляцы Бюлова перад будынкам ЦК кампартыі,** якая ўчора адбылася, **зьявілася выключна магутным рэвалюцыйным адказам працоўнага насельніцтва Бэрліну на правакацыйную дэманстрацыю нацыянал сацыялістаў 22 студзеня.** Ня гледзячы на выключны для Бэрліна холад (мароз дасягаў 20 градусаў), **калёны на працягу 4-х гадзін бязупынным патокам праходзілі міма будынку ЦК кампартыі.**

Асабліва моцнае ўражаньне зрабіў атрад рэвалюцыйнай антыфашысцкай самаабароны. Шматлікія беспрацоўныя прымалі ўдзел у дэманстрацыі, ня маючы нават цёплай верхняй вопраткі. Многія з-за адсутнасьці абутку ішлі ў лёгкіх хатніх туфлях. Паводле падлікаў **«Ротэ фанэ», у дэманстрацыі прымала ўдзел звыш 100 тыс. чалавек.** Усе вуліцы пралетарскіх раёнаў, па якіх праходзілі калёны, былі залоўнены шпалерамі працоўных, горача вітаўшымі дэманстрантаў воклічамі «рот фронт».

У многіх мясцох на тратуарах удзельнікам дэманстрацыі раздаваліся папяросы. З многіх пралетарскіх дамоў дэманстрантам выносілі гарачы чай і каву.

У радзе месц паліцыя нападала на дэманстрантаў нібы за сьпяваньне «забароненых песень» і за пясьненьне плякатаў і сьцягаў «з адтыдзяржаўнымі надпісамі». У розультаце сутычак з паліцыяй, паводле афіцыяльных паведамленьняў, было арыштавана 19 удзельнікаў дэманстрацыі. Рад буржуазных газэт адкрыта прызнае, што **гэта дэманстрацыя зьявілася аднэй з буйнейшых, якія калі-небудзь адбываліся ў Бэрліне.** «Калі на дэманстрацыі нацыянал-сацыялістаў 22 студзеня, — піша «Бэрлінэр тагеблят» — кідалася ў вочы вялікая колькасьць паліцэйскіх, дык учора твар дэманстрацыі вызначаўся рабочымі масамі, якія выступілі на заклік кампартыі. Паездка па гораду пераканала, што ўчарайшая дэманстрацыя была аднэй з вялізарнейшых, якія калі-небудзь адбываліся ў Бэрліне».

Выключную магутнасьць учарайшай дэманстрацыі прымушан прызнаць і **«Форвэртс»** у перадавым артыкуле, напісаным адказным рэдактарам гэтай газэты Штэмпфэрам. Увесь зьмест гэтага артыкулу накіраваў да таго, каб убіць клін паміж кампартыяй і шырокімі масамі рабочых і працоўных Бэрліну, якія ідуць за ёй. Але адначасова аўтар артыкулу канстатуе: «У трасучы мароз і над пранізьлівым ветрам гадзінамі ішлі масы ў лёгкіх куртках, у парваных бацінках. Дзесяткі тысяч бледных, гатовых на ахвяру за справу, якую яны лічаць правільнай. У іх воклічах гучэла нянавісьць супроць таго грамадзкага ладу, які асудзіў іх на галечу і жабрацтва»

ПАДРЫХТОЎКА ДА РОСПУСКУ РЭЙХСТАГУ

„Генэрал-рэйхсканцлер павінен дзейнічаць"

БЭРЛІН 23 студзеня рэйхсканцлер фон-Шлейхэр зрабіў прэзыдэнту Гіндэнбургу даклад аб унутрыпалітычным становішчы.

У сувязі з гэтым «Дэйчэ альгемэйне цэйтунг» падкрэсьлівае, што плян абвешчаньні Германіі ў стане так званай «дзяржаўнай патрэбы», г. зн. плян адкрытага ўстанаўленьня ўрадавай дыктатуры ўжо зараз канчаткова распрацаван і што ён будзе ажыцьцёўлен, як толькі высьветліцца нядбача спроб знайсьці «другі выхад са становішча».

Газэта адкрыта прызнае, што ажыцьцёўленьню барацьбы зараз вядзецца толькі вакол пытаньня аб асобе, якая будзе ўзначальваць гэты дыктатарскі ўрад.

Вячэрняя выданьні «Бэрлінэр Бэрзэн-цэйтунг», «Бэрлінэр тагеблят» і іншыя газэты паведамляюць, што перагаворы аб стварэньні парляманцкай большасьці ўжо пачаліся.

Для настроўу на ўмоўных колах правядзеньні надзвычай характэрны сёньняшні пярэдзім артыкул «Дэйчэ альгемэйне цэйтунг» пад загалоўкам «Гарэзіеў вузел» аўтарам газэты зьяўляецца адказны рэдактар гэтай газэты Фрыц Клейн, цесна зьвязаны з кіруючымі ўрадавымі і гаспадарчымі коламі. Клейн піша: «Пытаньне аб тым, ці зможа Шлейхэр кіраваць сумесна з цяперашнім рэйхстагам або з рэйхстагам, які будзе выбран пры кароткі час, улічваецца нам канчаткова вырашаным у адмоўным сэнсе. З прычыны таго, што страваць разам з рэйхстагам нельга, то яна працягу паўнага прамежку часу трэба кіраваць бяз рэйхстагу і Гіндэнбург стаіць перад неабходнасьцю прыняць надзвычай сур'ёзнае рашэньне. Ён адхіляе кандыдатуру Гітлера ў рэйхсканцлеры, аднак, ён не жадае спрыяць зьмяшчэньню гітлераўскага руху. Рэйхсканцлер і ўгод абяцаны прапанаваць Гіндэнбургу падыходзячыя сродкі для пераманьвання гэтага ўнутранага канфлікту. Чыстае скасаваньне пэўных частак канстытуцыі прадугледжана самой канстытуцыяй. Генэрал-рэйхсканцлер — заключае «Дэйчэ альгемэйне цэйтунг», — павінен дзейнічаць. Момант, калі гарэзіеў вузел павінен быць разрублен, наступіў».

РАШЭНЬНЕ СТУДЗЕНЬСКАГА ПЛЕНУМУ ЦК і ЦКК УсеКП(б) — У МАСЫ.

СЁНЬНЯ, 28 студзеня, у 8 гадзін вечара, у клюбе імя VII зьезду прафсаюзаў Беларусі (рог Энгельса і Камуністычнай)

МЕНГАРКОМ САЮЗУ РАБОТНІКАЎ КААПЭРАЦЫІ і ДЗЯРЖГАНДЛЮ

клікае

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ СХОД РАБОТНІКАЎ ПРЫЛАЎКУ.

ПАРАДАК ДНЯ:

Вынікі студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Дакладчык—нам. наркома ЦКК РСІ тав. ГУРЭВІЧ.

ПАСЬЛЯ СХОДУ—мастацкая частка.

Уваход па запрашальных білетах.

Менгарком саюзу РКІД.

Скрыпач з Флёрэнцыі. Звыш праграмы—кіно-хроніка Саюзкіно.

Інтэрнацыянал. Каса—ад 12 г. дня.

Замежны фільм па палявых дарогах. Дзённыя дзіцячыя сэансы ТРЫ ПАРАДА.

Кіно ПРАЛЕТАРЫ

29-га студзеня роўна ў 7 гадзін вечара, у памяшканьні Дзяржаў. Польскага тэатру (Савецкая № 29)

адбудзецца

ЗЬЛЁТ УДАРНІКАЎ ФІНФРОНТУ

гор. МЕНСКУ,

прысьвечаны заключэньню **овц. умовы з заходняй вобласьцю І ДНЮ ПАЗЫКАТРЫМАЦЕЛЯ".**

Пасьля дзелавой часткі—вялікая мастацкая частка.

Уваход па мандатах, якія разьмеркаваны па ФЗМК.

АРГКАМІСІЯ.

Першы Дзяржаўны Тэатр (БДТ—1)

СЕНЬНЯ

ЛЁН

пьеса ў 3-х дзеях

А. Міровіч

Пастаноўка заслуж. арт. рэсп. А. А Міровіча і М. А. Зорава.

Пачатак у 8 гадзін вечара.

СПАРТАК

Каса ад 1 г. дня.

Ад 27 студзеня

усходні мастацкі фільм

ЭЛІСО

драма ў 6 частках.

Штодзённа 5 сэансаў.

Каса—ад 1 гдз. дня.

СЁНЬНЯ, 28-га студзеня, у клюбе харчавікоў адбудзецца

масавы інтэрнацыянальны ВЕЧАР

МОПР-актыву г. Менску.

З дакладам аб рашэньнях сусьветнага кангрэсу МОПР выступіць старшыня ЦК МОПР БССР—удзельнік сусьветнага кангрэсу МОПР т. Домбаль, і прадстаўнік ЦК МОПР СССР тав. Дзірдо.

Пасьля дакладу—вялікі КАНЦЭРТ.

Ячэйкі МОПР павінны атрымаць запрашальныя білеты ў гаркоме МОПР.

Пачатак роўна ў 7 гадз. вечара, пасьля 3-га сыгналу ўваход у залю будзе закрыт.

Мен. ГК МОПР.

Архівітэт союзу савецкіх пісьменьнікаў Менгарпрафсавет Беларуская Акадэмія Навук

29 студзеня, у 7 гадзін вечара, у клюбе харчавікоў адбудзецца

УРАЧЫСТЫ ВЕЧАР,

прысьвечаны 70-гадзьдзю пралетарскага пісьменьніка

А. С. Серафімовіча

Праграма вечара:

1. Урачыстая частка.
2. Даклад выдавіца І. І. Замоціна — Творчы шлях А. С. Серафімовіча".
3. Вялікі КАНЦЭРТ у 2-х частках.

Білеты ў Менгарпрафсавеце.

Урачыстае пасяджэньне, прысьвечанае 10-годзьдзю дзярж. бібліятэкі.

Адбудзецца 28 студзеня ў памяшканьні бібліятэкі. (Чырвонаармейская, 9)

Пачатак у 7 гадз. вечара.

Пасьля пасяджэньня—мастацкая частка.

Уваход па дзеяных раней запрашальных білетах і чытальных білетах.

Менск, друкарня «Зьвязды». Галоўлітбел № 337.